ГІСТОРЫЯ — ПРАЗ ЭМОЦЫІ І ПАЧУЦЦІ 3

КАЛЯНДАР СТРЫЖАК НА КРАСАВІК 16

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

+TVПРАГРАМА

1 КРАСАВІКА 2022 г. ПЯТНІЦА № 63 (29685)

ЦЫТАТА ДНЯ

Ія МАЛКІНА, афіцыйны прадстаўнік Еўразійскай эканамічнай камісіі:

«У Еўразійскім эканамічным саюзе прымаюцца захады, каб не дапусціць дэфіцыту лекаў. Сумеснымі намаганнямі нашым краінам удалося пазбегнуць праблем з даступнасцю фармацэўтычнай прадукцыі ў перыяд пандэміі, нягледзячы на турбулентнасць на знешніх рынках. Адзначу, што ў ЕАЭС ужо пашыраны магчымасці спрошчанай і паскоранай рэгістрацыі лекаў, а таксама дыстанцыйных працэдур рэгістрацыі. Адпаведныя змяненні Савет ЕЭК унёс у правілы рэгістрацыі і экспертызы лекавых сродкаў для медыцынскага ўжывання. Рашэнне дазволіць спрасціць доступ пацыентаў да лекаў пры пагрозах узнікнення надзвычайных сітуацый, а таксама да груп прэпаратаў высокатэхналагічнай, прарыўной тэрапіі, арфанных лекаў».

Трыа «Землякі»

Браты Міхаіл і Мікалай АРХІПАВЫ і Анатоль КЛЯПЦОЎ — землякі, выраслі ў адной вёсцы Адамава Сенненскага раёна. У маладосці навучыліся іграць на гармоніках і, дзе б ні жылі і чым бы ні займаліся, музыка заўсёды была з імі побач. Анатоль Міхайлавіч *(на фота злева)* вядзе сялянска-фермерскую гаспадарку, у яго залатыя рукі — любіць збіраць аўтатрактарную тэхніку. Міхаіл Іванавіч, палкоўнік запасу, які займаў адказныя пасады ва ўнутраных органах, цяпер на заслужаным адпачынку, вывучыўся і грае на акардэоне. А вось Мікалай Іванавіч, таксама пенсіянер (ён жыве ў Віцебску) быў прафесійным баяністам. З узростам мужчыны не страцілі зямляцкіх пачуццяў, не аддаліліся, не забываюць сваю малую радзіму. Больш за тое, часта сустракаюцца, ладзяць музычныя пасядзелкі: прыгадваюць маленства, бацькоў, аднавяскоўцаў, спяваюць сучасныя песні і маладосці.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Сяўба-2022

ДОБРЫ СТАРТ І АПТЫМІСТЫЧНЫЯ ПЛАНЫ

На Гомельшчыне гаспадаркі масава выйшлі на веснавую сяўбу. На тэмпы пасяўной кампаніі, распачатай у рэгіёне, не паўплывалі апошнія невялікія мінусавыя тэмпературы. Ход работ — на асабістым кантролі старшыні аблвыканкама Івана КРУПКО.

Днямі кіраўнік рэгіёна прааналізаваў ход пасяўной кампаніі ў гаспадарках Светлагорскага раёна. Старшыня аблвыканкама звярнуў асаблівую ўвагу аграрыяў на тое, што Прэзідэнтам перад земляробамі краіны пастаўлена задача правесці веснавую палявую кампанію ў аптымальныя тэхналагічныя тэрміны, на 100 % выканаць дзяржаўны заказ і гарантаваць харчовую бяспеку краіны.

СТАР. 3

Гарадское асяроддзе

АБАЯННЕ НАБЯРЭЖНАЙ

Блізіцца да завяршэння рэканструкцыя прыбярэжнай паласы ракі Мухавец у Брэсце

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

На гэтым тыдні на набярэжнай у раёне Гарадскога саду працавала цяжкая тэхніка. Тут расстаўлялі велізарныя валуны, якія прывезлі з Камянецкага раёна. Дванаццаць каменных глыб стануць з часам паркам валуноў. Як паведаміў старшыня Брэсцкага гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК, над канцэпцыяй парку працуюць спецыялісты абедзвюх вышэйшых навучальных устаноў горада.

СТАР. 4

КАРАТКА

- Прэзідэнт падпісаў Указ аб развіцці СМІ, якім устанаўліваецца збор за размяшчэнне рэкламы ў памеры 10 працэнтаў пры размяшчэнні вонкавай рэкламы і рэкламы на транспарце, у іншых выпадках — 20 працэнтаў ад кошту паслуг па распаўсюджванні рэкламы. Збор будзе выплачвацца рэкламадаўцамі і накіроўвацца на падтрымку дзяржаўных СМІ.
- **Прафіцыт рэспубліканскага бюджэту Беларусі ў студзені—лютым склаў Br1 млрд.**

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Мы не проста выстаім, а адродзімся, як фенікс з попелу»

Напярэдадні Дня адзінства народаў Беларусі і Расіі Палац Незалежнасці сустракаў дэлегацыю Пензенскай вобласці на чале з губернатарам Алегам Мельнічэнкам. З пачатку года гэта ўжо трэцяя сустрэча Прэзідэнта Беларусі з прадстаўнікамі рэгіёнаў Расіі. Да пачатку пандэміі такія візіты былі рэгулярнымі, цяпер традыцыя аднаўляецца. Штомесяц Аляксандр Лукашэнка вітае ў сваёй рэзідэнцыі губернатараў. У студзені ў Мінск упершыню прыязджала прадстаўнічая дэлегацыя Рэспублікі Тыва, не прайшло і двух тыдняў, як сустракалі губернатара Санкт-Пецярбурга Аляксандра Бяглова. Цяпер эстафету кантактаў з рэгіёнамі Расіі працягвае Пенза.

ЧАС МАГЧЫМАСЦЯЎ

Партнёрства рэгіёнаў Беларусі і Расіі заўсёды было, як прынята казаць сярод журналістаў, лакаматывам супрацоўніцтва дзвюх краін. Але сёлета яно атрымала асаблівае значэнне. Санкцыі ў дачыненні да Беларусі пашыраюцца, але наша краіна не застаецца ў санкцыйнай «адзіноце» — замежныя партнёры ўвялі яшчэ большыя абмежаванні і для Расіі. Як прызвычаіцца да такіх абставін, захаваць эканоміку і не пагоршыць узровень жыцця, Беларусь і Расія імкнуцца вырашаць разам.

Таму зразумела, што з дадзенай тэмы і пачаў перагаворы з дэлегацыяй Аляксандр Лукашэнка.

«Сустракаемся мы з вамі ў няпросты час, час складаны, але час і вялікіх магчымасцяў. Верагодна, нам неабходна было перажыць гэты перыяд, каб зразумець, не толькі ў які мы час жывём, але і як нам развівацца далей. Думаю, што апошнія месяцы, ды і год-паўтара сур'ёзна нас працверазілі. Мы зразумелі, што абараніць сябе мы можам толькі самі. Мы нікому не патрэбныя. Мы гэта зразумелі раней, а цяпер і Расія гэта зразумела, як ніколі. Мы гатовыя не ўпусціць гэты час магчымасцяў», — сказаў гасцям Прэзідэнт.

Паводле яго, на нашы краіны навалілася значныя санкцыі з боку «партнёраў». «Вось якія яны «партнёры»! Але ніхто не сумняваецца, што мы не проста выстаім, а адродзімся, як фенікс з попелу. Нам у гісторыі не адзін раз прыходзілася гэта рабіць», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

ДАЛЕЙ БУДЗЕМ РАЗВІВАЦЦА САМІ

Пензенская вобласць займае асаблівае месца ў шэрагу адносін Беларусі з расійскімі рэгіёнамі. Ключавымі пунктамі ўзаемадзеяння з'яўляюцца гандаль і інвестыцыі. На гэтых кірунках і далей засяродзяць увагу, але не выключае Аляксандр Лукашэнка і выкарыстання іншых напрамкаў для супрацоўніцтва, у тым ліку гуманітарнага.

У 2021 годзе тавараабарот Беларусі з вобласцю перавысіў адзнаку ў 100 мільёнаў долараў ЗША. Плён даюць такія напрамкі супрацоўніцтва, як падрыхтоўка кадраў для сельгаспрадпрыемстваў Пензенскай вобласці, абмен сучаснымі тэхналогіямі ў насенняводстве і племянной жывёлагадоўлі. У Беларусі валодаюць такімі прасунутымі тэхналогіямі, заявіў Прэзідэнт, і гатовыя заўсёды падзяліцца.

«Сфера будаўніцтва — яшчэ адзін кірунак, па якім можам паспяхова супрацоўнічаць. Гэта і жыллёвае будаўніцтва, і сацыяльныя аб'екты. Ды і прамысловыя аб'екты мы захавалі з савецкіх часоў. І ў тыя часы Беларусь была маяком у будаўніцтве. Да нас прыязджалі з усяго Саюза і вучыліся, як будаваць. Гэта заслуга не толькі беларускіх будаўнікоў, архітэктараў, праектантаў, а ўсёй вялікай краіны», — дадаў Прэзідэнт.

Асаблівая тэма, якую заўсёды на сустрэчах падкрэсліваюць кіраўнікі дзвюх краін, — актыўнае стварэнне сумесных вытворчасцяў у машынабудаўніцтве, сельскай гаспадарцы, навукова-тэхнічнай сферы. Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што беларусы ў згаданых галінах стараліся справіцца без вопыту замежнікаў.

«Таму ўведзеныя санкцыі па нас так не ўдарылі, як, напрыклад, па КАМАЗе. Туды зайшлі немцы. Мы гэтым кірункам асабліва не песцілі нашых машынабудаўнікоў, як маглі, працівіліся гэтаму. У нас таксама немцы працавалі: і МАЗ-MAN, і «Неаплан» былі ў свой час на МАЗе. Кантракты скончыліся — я ім руку паціснуў і сказаў: «Дзякуй, далей мы будзем развівацца самі. Чаго б ні каштавалі нам гэтыя складанасці». Мы і Расіі прапаноўвалі такія кірункі супрацоўніцтва. Тады ваша кіраўніцтва меркавала: калі прыйдуць немцы ці амерыканцы — гэта выдатныя тэхналогіі і шчасце. Вось шчасце атрымалі», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, з Уладзімірам Пуціным дамовіліся, што Расія будзе карыстацца вопытам Беларусі ў тых сферах, дзе мы маем большыя кампетэнцыі, а дзе ў Расіі ёсць прасунутыя тэхналогіі, павінны іх пераймаць беларусы.

«Але неабходна ствараць сумесныя прадпрыемствы. Тады не будзе балбатні аб нейкай адзінай дзяржаве, валюце. Эканоміка нас выведзе на той узровень і прывядзе да таго, што павінна існаваць паміж нашымі дзяржавамі. Эканоміка — гэта фундамент любых адносін», — канстатаваў Прэзідэнт.

ЧАМУ ЗАХАД СКРЫГОЧА ЗУБАМІ?

Кіраўнік краіны яшчэ раз падкрэсліў, што беларусы гатовыя падтрымаць Пензенскую вобласць ва ўсім, што яе зацікавіць у нашай краіне.

«Упэўнены, што наступіў такі час, калі і мы можам разлічваць на плячо, якое Расія можа падставіць нашай Беларусі. У сувязі з гэтым мы гатовыя абмяркоўваць любыя пытанні і прымаць любыя рашэнні, калі тое патрабуецца», — заявіў Прэзідэнт і папрасіў расказаць кіраўніка дэлегацыі пра свае пажаданні і ўражанні ад візіту ў Беларусь.

Алег Мельнічэнка падзякаваў за прыём дэлегацыі і паведаміў, як рыхтаваліся да камандзіроўкі: прааналізавалі асартымент прадукцыі, якая цікавіць, паглядзелі праблемныя пытанні па імпартазамяшчэнні.

«Рэспубліка ваша для мяне родная. Я апошні раз тут быў у жніўні 2020 года і каардынаваў рабочую групу МПА СНД назіральнікаў на вашых выбарах», — адзначыў губернатар.

«Вы няшмат парушэнняў заўважылі?» — запытаў Прэзідэнт.

«Не было іх увогуле. Мы ездзілі па ўсёй тэрыторыі краіны, я перамяшчаўся па Мінску ўвесь дзень па выбарчых участках. Ніякіх парушэнняў мы не заўважылі, што і сказалі на прэс-канферэнцыі», — паведаміў Алег Мельнічэнка.

«У нас быў вельмі складаны перыяд пасля 2020 года. Мы рыхтаваліся да рэферэндуму па змяненні Канстытуцыі, дэмакратызавалі яе. Дыктатура-дыктатура — трэба было рухацца наперад. Многія ў нас у грамадстве, так званыя «Ябацькі» (я ж Бацька — прыхільнікі Прэзідэнта), прапаноўвалі не праводзіць рэферэндум. Я выказаўся супраць, бо паабяцаў. А сам думаў: няхай людзі і пакажуць на рэферэндуме, хто ёсць хто. Рэферэндум прайшоў — і цішыня. Нават Захад уціхамірыўся, сказаць няма чаго», — выказаўся кіраўнік краіны.

Ён працягнуў, што ў Захаду не атрымалася зладзіць у Беларусі «майдан» як ва Украіне, каб адрэзаць нашу краіну ад Расіі.

«Украіна ўжо там была. Трэба было Беларусь разам паставіць. І аперацыю, якую праводзяць ва Украіне, немагчыма было б правесці, калі б дзве рэспублікі былі б падмятыя пад іх. У іх (апанентаў на Захадзе. — **«Зв.»**) тут не атрымалася. Яны цяпер ходзяць і зубамі скрыгочуць, таму неабходна неяк усё перавярнуць. Таму санкцыі ўводзяць супраць Расіі і санкцыі ўводзяць супраць Беларусі, каб Расія свае не абышла», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

Каментарый у тэму

Алег МЕЛЬНІЧЭНКА, губернатар Пензенскай вобласці: «Сёння з Прэзідэнтам вырашылі пытанне па пастаўцы трактароў і камбайнаў у Пензенскую вобласць. Акрамя таго, мы зацікаўленыя ў дарожнай тэхніцы. Гатовыя каля 200 МАЗаў закупіць сёлета. У нас ідзе праграма капітальнага рамонту дамоў. То-бок закупілі каля 50 ліфтаў для замены ў 2021 годзе. А ўсяго нам у найбліжэйшыя гады прыйдзецца памяняць каля 500 ліфтаў. Усе ведаюць, што беларускія ліфты найлепшыя ў свеце. Вялікую колькасць таго, што мы закуплялі ў Еўропе, можна імпартазамясціць за кошт магчымасцяў Рэспублікі Беларусь. Вы не стаіце на месцы, добра развіваецеся. Мы цяпер разумеем, што мы павінны імпартазамяшчаць і за кошт каго. І тут роля Беларусі велізарная. Пензенская вобласць — цукаравытворчы рэгіён. У нас 56 гектараў тэрыторыі аддадзена пад цукровыя буракі. На жаль, насенне французскае і буракаўборачная тэхніка таксама замежная. Тут мы бачым зачын для супрацоўніцтва па селекцыйным насенні і па сумеснай вытворчасці буракаўборачнай тэхнікі».

Марыя ДАДАЛКА.

Парламенцкі дзённік

СВЯТЫНІ ТРЭБА БЕРАГЧЫ

У Савеце Рэспублікі абмеркавалі пытанне будаўніцтва трапезнай у Спаса-Ефрасіннеўскім жаночым манастыры ў Полацку

У 2025 годзе святыня, заснаваная прападобнай Ефрасінняй Полацкай, адзначыць 900-годдзе. Сярод шэрагу мерапрыемстваў, якія запланаваны ў межах святкавання юбілею, прадугледжана і будаўніцтва трапезнай.

Фота БелТА.

Справа ў тым, што манахіні прымаюць ежу ў старым драўляным будынку, які не толькі знаходзіцца ў дысанансе з архітэктурай манастыра, але і не адпавядае сучасным нарматывам і патрабаванням. Акрамя таго, у дрэнным стане пакоі, у якіх гатуецца ежа. Не можа змясціць цяперашняя трапезная і ўсю колькасць манахінь. Узвядзенне новага будынка дазволіць дапоўніць комплекс манастыра, стварыць годныя ўмовы яго насельніцам, а таксама забяспечыць выкананне санітарных і тэхналагічных нормаў.

Будаўніцтва трапезнай стане адным з мерапрыемстваў святкавання 900-годдзя Спаса-Ефрасіннеўскага жаночага манастыра. «Створаны арганізацыйны камітэт, вызначаны мерапрыемствы па правядзенні гэтай важнай падзеі ў нашай краіне, у гісторыі праваслаўя, — паведаміла **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА**. — Ёсць два аб'екты, якія патрабуюць і фінансавання, і дастаткова працяглага часу па адпрацоўцы: гэта будаўніцтва трапезнай і рэканструкцыя былога аддзялення сувязі пад гасцініцу. Трапезнай па сутнасці сёння ў манастыры няма, а там знаходзіцца 136 манахінь. Акрамя таго, трэба ўлічваць і супрацоўнікаў манастыра. Гэта дастаткова вялікая колькасць людзей, якая кожны дзень харчуецца. Прычым сюды прыязджае шмат паломнікаў, проста прыходзяць людзі, якіх трэба накарміць. Манастыры спакон веку займаліся дабрачыннасцю і падтрымкай тых, каму гэта патрэбна».

Падчас нарады была пастаўлена задача зрабіць таннейшым будаўніцтва аб'екта. У цяперашні час ажыццяўляецца распрацоўка праектна-каштарыснай дакументацыі. Як расказаў **старшыня Полацкага райвыканкама Ігар МАРКОВІЧ**, завяршыць работы па будаўніцтве новай трапезнай плануецца ў снежні 2024 года. «Праектаваць трэба прыкладна на 170 пасадачных месцаў, — удакладніў ён. — Гэта павінен быць асобны корпус: папярэдне — крыху больш чым тры тысячы квадратных метраў. Неабходныя і дапаможныя памяшканні. 14 месяцаў патрабуе толькі будаўніцтва».

— Спаса-Ефрасіннеўскі жаночы манастыр у Полацку — гэта калыска праваслаўя ў нашай краіне, — адзначыў **Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр РУМАК**. — Вельмі важна сустракаць гэты юбілей у самым старым манастыры нашай краіны. Менавіта ў Полацку ўзнікла праваслаўе. Сёлета адзначаецца 1030-годдзе Полацкай епархіі. У Год гістарычнай памяці мы яшчэ раз падкрэсліваем тую ролю, якую іграе наша дзяржава ў захаванні нашых святынь, культурнай спадчыны беларускага народа.

Аляксандр Румак заўважыў, што нашы духоўныя святыні з'яўляюцца яшчэ і аб'ектамі рэлігійнага турызму: сюды прыязджае вельмі шмат паломнікаў — не толькі са шматлікіх куткоў Беларусі, а і з Расійскай Федэрацыі, іншых краін. Менавіта ў супрацоўніцтве дзяржавы і рэлігійных арганізацый, па яго словах, ажыццяўляюцца меры па захаванні і развіцці нашай культурнай спадчыны.

Вераніка КАНЮТА.

Блізкая ўлада

ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 2 красавіка, з 9.00 да 12.00, правядуць:

• намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;

• намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Барыс Сяргеевіч ЯФРЭМАЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

• намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Анатольевіч БАРАНОЎСКІ. Тэл. 8 023 233 12 37;

• намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віталь Іосіфавіч НЯВЕРА. Тэл. 8 015 273 56 44;

• намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Руслан Барысавіч СТРАХАР. Тэл. 8 022 250 18 69;

• намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч КРУЧАНАЎ. Тэл. 8 017 500 41 60;

• старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй Аляксандравіч БУГРОЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.

ДОБРЫ СТАРТ І АПТЫМІСТЫЧНЫЯ ПЛАНЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Губернатар падкрэсліў, што ва ўсіх раёнах вобласці цяпер актыўна праходзяць веснавыя палявыя работы. Тэмпы пасяўной захоўваюць высокую інтэнсіўнасць. Пасеяна звыш 27 % запланаваных плошчаў ранніх яравых культур.

— У параўнанні з мінулым годам гэты паказчык значна вышэйшы, што гаворыць аб спрыяльных умовах надвор'я, і высокі тэмп пасяўной кампаніі. Калі ўдасца захаваць такі рытм, то можна разлічваць, што сяўбу ранніх яравых збожжавых культур у Гомельскай вобласці мы зможам завяршыць ужо ў сярэдзіне красавіка, — адзначыў Іван Крупко.

Што датычыцца Светлагоршчыны, то, як адзначылі кіраўнік раёна Дзмітрый Алейнікаў і начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання выканкама Артур Стралец, усе гаспадаркі раёна масава пачалі вясновую сяўбу. Каб якасна выканаць пастаўленыя задачы, у раёне скансцэнтравана дастатковая база насення ранніх яравых каласавых культур, падрыхтавана каля дзвюх тысяч тон насення, што складае 121 % ад патрэбнасці. Для выканання плана яравой сяўбы ў аптымальныя тэрміны яшчэ з восені было ўзнята больш як 13 тысяч гектараў зяблёва, праведзена веснавое ўзворванне на плошчы звыш 1,2 тысячы гектараў, падрыхтавана каля дзвюх тысяч гектараў глебы пад сяўбу ранніх каласавых культур.

— Сёлета ў сувязі з павелічэннем цэн на бялок і яго недахопам мы павялічылі на 300 % сяўбу сланечніка. Плюс павялічылі сяўбу рапсу, каб забяспечыць раён сваёй бялковай сыравінай. Рапс і сланечнік — культуры рэнтабельныя. Дадуць нам магчымасць замяніць імпартны бялок на свой для забеспячэння жывёлагадоўлі, — паведаміў Артур Стралец.

Сёлета сланечнік плануюць пасеяць пяць гаспадарак раёна. Сярод іх і сельгаспрадпрыемства — філіял «Дуброва-Агра» РУП «Гомельэнерга». Гэту гаспадарку падчас візіту на Светлагоршчыну наведаў губернатар.

Як было адзначана, дадзенае сельгаспрадпрыемства добра паклапацілася аб пасяўным матэрыяле не толькі ранніх яравых каласавых культурах, але і кукурузы як аднаго з асноўных кампанентаў для сферы жывёлагадоўлі. У філіяле «Дуброва-Агра» тэхніка амаль цалкам падрыхтаваная да работ, наяўнасць насення і ўгнаенняў — у адпаведнасці з патрэбнасцямі. Што датычыцца структуры пасяўных плошчаў, як адзначылі ў гаспадарцы, яна скарэкціраваная з улікам сітуацыі на рынку харчавання.

На тэрыторыі філіяла «Дуброва-Агра» РУП «Гомельэнерга» Іван Крупко таксама наведаў будпляцоўку гаспадаркі ў вёсцы Зарэчча. Тут працягваецца ўзвядзенне новага сучаснага жывёлагадоўчага комплексу, увод якога ў эксплуатацыю запланаваны на канец бягучага года.

У канцы сустрэчы з аграрыямі раёна губернатар звярнуў асаблівую ўвагу, што пры спрыяльных умовах аграпрамысловы комплекс рэгіёна здольны ўнесці значны ўклад у агульны беларускі каравай.

— Згодна з прагнозамі, магчыма атрымаць каля 1-1,1 мільёна тон збожжа збожжавых і зернебабовых, кукурузы на зерне каля 300 тысяч тон, бульбы — 100 тысяч тон, 50 тысяч тон агародніны, каля 4 мільёнаў тон кукурузнага сіласу, 1,5 мільёна тон сенажу, — заўважыў кіраўнік рэгіёна. — З такім вынікам мы зможам атрымаць таварную прадукцыю ў раслінаводстве, забяспечыць дзяржзаказ, іншымі словамі, поўнасцю вырашыць пастаўленыя перад агракомплексам вобласці задачы.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

Надвор'е

ДА НАС ЗАЗІРНУЛА КАРОТКАЯ ЗІМА

І пачатак красавіка ў Беларусі часам паказвае, што другі месяц вясны бывае капрызны. Учора мы прачнуліся, а на дварэ снег. Ды і холадна неяк, таму што тэмпература паветра ўначы дасягае часам 10 марозу, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У суботу захаваецца ўплыў франтальных раздзелаў, якія звязаны з паўднёвым цыклонам і перамяшчаюцца да нас праз Украіну. Будзе воблачна, па паўночным захадзе краіны з прасненнямі. На большай частцы краіны пройдуць ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу, па паўднёвым усходзе з дажджом. Месцамі чакаецца слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер паўночна-заходні парывісты, удзень месцамі моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 5 градусаў па паўночным захадзе да 3 цяпла па паўднёвым усходзе краіны. Удзень ад нуля да плюс 6 градусаў.

Самы халодны дзень (дакладней ноч) красавіка наступіць у нядзелю. З красавіка тэрыторыя краіны будзе знаходзіцца ў полі паніжанага атмасфернага ціску, сфарміраванага ў халоднай паветранай масе. У гэты дзень па паўднёвым усходзе краіны захаваецца ўплыў франтальнага раздзелу. Будзе воблачна з прасненнямі. Уначы пераважна па паўднёва-ўсходняй палове краіны, а ўдзень па Гомельскай вобласці пройдзе кароткачасовы снег і мокры снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер паўночна-заходні, паўночны ўмераны, уначы парывісты. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 1 градуса да мінус 6 градусаў, пры прасненнях да 9 марозу. Удзень красавіцкае сонца разагрэе паветра ад нуля да 7 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

Навацыі ў адукацыі

ВЫВУЧАЦЬ ГІСТОРЫЮ ПРАЗ ЭМОЦЫІ І ПАЧУЦЦІ

Мабільную праграму «Дзённік падарожніка» распрацуюць для школьнікаў. Аб гэтым расказала намеснік дырэктара па метадычнай рабоце Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства Лідзія ЖУР падчас праведзенага круглага стала ў БелТА.

«Гэта аналаг папяровага варыянта дзённіка падарожніка: у ім можна будзе ў электронным выглядзе аформіць інфармацыю аб тых мясцінах воінскай славы, якія дзеці наведалі. Мы пакуль знаходзімся на пачатковай стадыі распрацоўкі, але многім ужо цікава. Дзеці, асабліва малодшага школьнага ўзросту, любяць па-мастацку афармляць свае работы, што дазваляе лепш запомніць, адкласці ў памяці тое, што ім удалося ўбачыць. І дадатак будзе гэтаму толькі спрыяць», — паведаміла Лідзія Жур.

Паводле яе слоў, у Беларусі вялікая ўвага аддаецца адукацыйнаму турызму. У краіне рэалізуецца пілотны праект, дзякуючы якому дзеці бясплатна могуць наведваць разнастайныя аб'екты, у тым ліку ваенна-гістарычныя, якія вывучаюцца ў рамках школьнай праграмы. Такая праграма распрацавана і для студэнтаў ВНУ. Сёння акцэнт у адукацыі робіцца на развіццё онлайн-формаў. «Дзеці любяць такі падыход, яны зацікаўленыя, самі імкнуцца ўдзельнічаць, ствараюць 3D-музеі. Дарэчы, апошнім часам мы працуем над стварэннем адзінай інфармацыйнай платформы «Патрыёт.by», да яе падключана больш як 70 устаноў адукацыі. Платформа дае магчымасць вялікай колькасці людзей далучацца да розных мерапрыемстваў і пры гэтым быць не проста слухачамі, а актыўна ўключацца ў працэс», — дадала намеснік дырэктара Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства.

Разам з пошукам новых формаў работы працягваецца рэалізацыя ўжо звыклых. «Праводзяцца інфармацыйныя гадзіны, дыспуты, прэс-канферэнцыі, інтэграваныя ўрокі. Працуе больш за 400 пошукавых аб'яднанняў, якія непасрэдна займаюцца пошукавадаследчай дзейнасцю, удзельнічаюць у раскопках згодна з заканадаўствам. Яны ахопліваюць больш як чатыры тысячы навучэнцаў. Працягваюць работу ваенна-патрыятычныя клубы, пастаянна адкрываюцца новыя. Дзеці з задавальненнем іх наведваюць. І, безумоўна, Міністэрства абароны прыкладае ўсе намаганні, каб ім было цікава.

Таксама школьнікі вядуць пошукавую работу на базе музеяў ва ўстановах адукацыі У краіне такіх налічваецца каля 1,5 тысячы, з іх больш за 200 мае ваенна-гістарычную накіраванасць. Матэрыялы для іх збіраюць у тым ліку самі дзеці. Яны знаходзяць інфармацыю аб сваіх блізкіх, земляках, у іх з'яўляецца вялікая цікавасць да гэтай тэмы.

Для эфектыўнай работы ў сферы патрыятычнага выхавання можна выкарыстоўваць метад структураванай драмы. Аб гэтым расказала падчас круглага стала **метадыст вышэйшай катэгорыі ўпраўлення вучэбна-метадычнай работы Акадэміі паслядыпломнай адукацыі Венера ВАРАНОВІЧ**.

«Гэта новая форма і падыход, сутнасць якога ў тым, каб спазнаваць і вывучаць нешта праз эмоцыі і пачуцці. Ужо прайшоў шэраг семінараў. Так, на адным з іх мы разбіралі подзвіг Мікалая Кісялёва, які вывеў за лінію фронту праз Сураўскія вароты больш за 200 чалавек. На базе дакументаў, успамінаў удзельнікі семінара пераўвасабляліся ў дзеючых асоб гісторыі. Эмоцыі прапускалі праз сябе, што дазваляе дасягаць патрэбнага выніку», — удакладніла Венера Варановіч.

Яна таксама паведаміла, што набірае ўсё большую папулярнасць такая форма работы, калі ў анлайн-фармаце ўзаемадзейнічае некалькі ўстаноў. Напрыклад, непасрэдна на ўроку праходзіць анлайн-экскурсія па музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, зносіны з экскурсаводам. Ёсць падобная практыка і ў Брэсцкай крэпасці. Ці калі школы праводзяць сумесныя анлайн-заняткі. Дзеці атрымліваюць заданні, разам працуюць і пазней абмяркоўваюць атрыманыя вынікі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

МВФ: санкцыі супраць Расіі могуць аслабіць панаванне долара і фрагментаваць валютную сістэму

Беспрэцэдэнтныя фінансавыя санкцыі, уведзеныя супраць Расіі, пагражаюць паступова аслабіць панаванне долара ЗША і прывесці да больш фрагментаванай міжнароднай валютнай сістэмы. Пра гэта ў інтэрв'ю Financial Times заявіла першы намеснік дырэктара-распарадчыка Міжнароднага валютнага фонду Гіта Гапінат.

Па словах Гіты Гапінат, радыкальныя меры, уведзеныя заходнімі краінамі ў дачыненні да Расіі, уключаючы санкцыі ў дачыненні да Цэнтральнага банка РФ, могуць садзейнічаць узнікненню невялікіх валютных блокаў, заснаваных на гандлі паміж асобнымі групамі краін.

«Долар застанецца асноўнай сусветнай валютай нават у такой сітуацыі, але фрагментацыя на меншым узроўні, безумоўна, цалкам магчымая, — сказала эксперт. — Мы ўжо бачым гэта, калі некаторыя краіны пераглядаюць валюту, у якой ім плацяць за гандаль».

Гіта Гапінат адзначыла, што доля долара ў міжнародных рэзервах ужо ўпала з 70 працэнтаў да 60 працэнтаў за апошнія два дзесяцігоддзі са з'яўленнем іншых гандлёвых валют.

Латвійская чыгунка рыхтуецца скараціць 600 супрацоўнікаў з-за падзення грузаперавозак

З-за падзення аб'ёмаў грузаперавозак Латвійская чыгунка рыхтуецца звольніць яшчэ каля 600 супрацоўнікаў, заявіў міністр шляхоў зносін Латвіі Таліс Лінкайтс, паведамляе Delfi.

«Першыя накіды сведчаць аб тым, што прыкладна 600 супрацоўнікаў яшчэ можна звольніць», — заявіў міністр. Паводле яго слоў, ЛЧ даручана падрыхтаваць песімістычны і аптымістычны сцэнарыі развіцця і праграму дзеянняў на выпадак скарачэння работнікаў. Канкрэтны план дзеянняў можа быць вядомы ў маі.

Таліс Лінкайтс паведаміў, што цалкам замяніць расійскія і беларускія грузы на чыгуначным транспарце не ўдасца, але вядзецца работа па замяшчэнні іх грузамі іншых краін, такіх як Казахстан, Узбекістан і Кітай.

У 2021 годзе Латвійскай чыгункі прыйшлося скараціць амаль 1,4 тысячы чалавек.

Лаўроў: асноўная перашкода для прызнання талібаў — неінклюзіўнасць іх урада

Кіраўнік Міністэрства замежных спраў РФ Сяргей Лаўроў заявіў, што асноўнай перашкодай для афіцыйнага прызнання талібаў з'яўляецца недастатковая інклюзіўнасць іх урада. Пра гэта паведамляе РІА «Навіны».

«На наш погляд, асноўнай перашкодай для афіцыйнага прызнання новага ўрада ў Кабуле застаецца яго недастатковая рэпрэзентатыўнасць — маю на ўвазе адсутнасць у органах улады тых асоб, якія прадстаўлялі б інтарэсы не толькі розных этнічных груп краіны, але і нацыянальных і канфесійных меншасцяў і палітычных сіл. Пры выкананні гэтых умоў вызначальная роля афіцыйнага прызнання ўрада талібаў павінна належаць ААН», — лічыць Лаўроў.

Ён падкрэсліў, што ААН трэба быць галоўным каардынатарам пры вырашэнні ўсяго комплексу праблем постканфліктнага аднаўлення Афганістана.

Сталічны ракурс

ПАДСТАВІЦЬ ПЛЯЧО МОЛАДЗІ

У сценах БДУІР адбылася выніковая нарада галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінгарвыканкама. Сустрэча прайшла па тэме «Арганізацыя ідэалагічнай работы ў г. Мінску ў 2021 годзе і задачах на 2022 год».

Начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінгарвыканкама Вольга ЧАМАДАНАВА падкрэсліла, што сёння ўсе структуры ідэалагічнай «вертыкалі» працуюць адной камандай.

— На бягучы момант 2022 года мы можам казаць аб выніках, якія з'явіліся за мінулы перыяд. Гэта новыя праекты, якія мы актыўна развіваем. Яны найперш звязаныя з маладзёжнай палітыкай. Менавіта мы арыентаваныя на моладзь, удзяляем ёй асаблівую ўвагу. Гэта выяўляецца ў правядзенні культурных патрыятычных мерапрыемстваў, у якія ўцягнута ўся моладзь без выключэння. Стартавалі новыя праекты, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне. Запланаваны шырокія дыялогавыя пляцоўкі ва ўстановах адукацыі сталіцы. Да гэтых мерапрыемстваў актыўна далучаюцца грамадскія арганізацыі Мінска. У моладзі ёсць запыт на прадастаўленне тэматычных пляцовак для самарэалізацыі. І важна, што моладзь з'яўляецца не толькі ўдзельнікам гэтых мерапрыемстваў, але і іх ініцыятарам. А мы можам падставіць плячо і падзяліцца сваім прафесійным досведам. Тым больш у нас ёсць усе рэсурсы, каб працаваць актыўна і аператыўна рэагаваць на запыты, якія ставіць перад намі жыццё. Сёння немагчыма працаваць паасобку. У нас адна мэта і адна ідэя.

Міністр адукацыі Беларусі Андрэй ІВАНЕЦ адзначыў, што для моладзі і ў цэлым для насельніцтва Беларусі пытанні ідэалагічнага і патрыятычнага выхавання выйшлі на першы план.

— Кожны кіраўнік любой установы адукацыі павінен разумець, што пытанні выхавання — гэта яго асабістая і персанальная адказнасць. Гэтая работа не павінна быць фармальнай. Сёння моладзь вельмі адчувальная да таго, як з ёй выбудоўваюць дыялог. Яе цікавіць шмат пытанняў, і мы мусім даць на іх адказы. Тым больш што ў нашай краіне, як адзначыў кіраўнік дзяржавы, ёсць усе выходныя пазіцыі. Нам не трэба распаўсюджваць фэйкі для таго, каб данесці праўду да людзей. Мы жывём у нармальнай краіне, і кожны павінен разумець, што гэта прадмет гонару.

Андрэй Іванавіч не пакінуў без увагі і надзённую праблему ў адукацыі — з дзецьмі ўкраінскіх бежанцаў. Міністр адукацыі запэўніў, што сёння выбудавана поўная работа па прыёме ўсіх дзяцей, якія прыязджаюць з Украіны на тэрыторыю Беларусі. Ім знаходзяць месцы ва ўстановах дашкольнай і сярэдняй адукацыі.

Да нарады была прымеркавана тэматычная выстава-прэзентацыя «Захоўваем гістарычную памяць — памнажаем духоўныя каштоўнасці сталіцы». На экспазіцыі былі прадстаўлены прадпрыемствы, арганізацыі, грамадскія аб'яднанні сталіцы, іх значныя праекты і акцыі. Яе наведаў **старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ**.

Метадыст Наталля Самургана прадстаўляла на выставе ўпраўленне па адукацыі Партызанскага раёна, які ідзе ў нагу з часам. Адукацыйны тэлеграм-канал Партызанскага раёна прадстаўлены рубрыкамі, што дапамагаюць згадаць гісторыю Беларусі, атрымаць веды аб беларускай мове і наведаць музейны квэст.

— У нас быў праведзены невялікі аналіз: каб не страціць падпісчыкаў, тэлеграм-канал павінен весціся правільна, разумна і сучасна. Вылучылі рубрыкі, якія не толькі цікавяць, але і прадстаўляюць інфармацыю, якая для падлеткаў даступная — кароткая, лаканічная. Рубрыкі вядуцца педагогамі Партызанскага раёна. Мы пастараліся прадставіць найбольш значныя і ўжо створаныя ў раёне віртуальныя музеі, турыстычныя маршруты па Партызанскім раёне. У рубрыцы «Музейны квэст» можна з дапамогай тэлефона наведаць выставу, бо ўсе экспанаты алічбаваныя праз QR-коды.

Адным з яркіх герояў выставы стаў Кірыл Манулік, дзесяцікласнік сталічнай гімназіі № 146. Хлопец са сваім праектам «Пчаліны вартаўнік» стаў фіналістам на конкурсе «100 ідэй для Беларусі».

— Уплыў пчол на ўраджайнасць, харчовую бяспеку чалавецтва велізарны. Праект складаецца ў тым, што для захавання пчалінай прадукцыі я вырабіў лекі з ігліцы сібірскай. Яна выкарыстоўваецца ў хімічных вырабах і харчовай прамысловасці, а таксама цалкам бяспечная для пчол. Навуковая работа пісалася з настаўнікам біялогіі. Я спачатку проста цікавіўся і глядзеў літаратуру па дадзенай тэме. Пасля доўгіх экспериментаў было вырашана аб'яднаць у выгадны тандэм кроп і ігліцу.

На нарадзе асаблівае месца ў ідэалагічнай рабоце з моладдзю было адведзена распаўсюджванню рознай інфармацыі. Вольга Чамаданава звярнула ўвагу на Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, на якую абапіраюцца пры рабоце з падрастаючым пакаленнем.

— Сёння мы занадта часта гаворым аб фэйках. Моладзь павінна атрымліваць аб'ектыўную, праўдзівую і праверануюінфармацыю. Гэта залежыць і ад работы журналістаў, і ад нас як ідэолагаў. Мы гатовыя даваць тую інфармацыю, якая патрабуецца аператыўна, гатовыя ўступаць у пэўную дыскусію, калі гэта спатрэбіцца і, вядома ж, абвяргаць тое, што сёння спрабуюць нам навязаць у тым ліку і заходнія краіны.

За 2021 год з'явілася шмат цікавых праектаў, пра якія мы раней не разважалі. Сёння гэтыя праекты ініцыіруе сама моладзь, а мы яе падтрымліваем.

Аляксей КАРПУК.

АБАЯННЕ НАБЯРЭЖНАЙ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пакуль канцэпцыя трымаецца ў сакрэце, але ж зразумела, што гэтыя прыродныя помнікі ўпрыгожаць сабой участак набярэжнай, якая паступова становіцца славутасцю абласнога цэнтра. Варта сказаць, што да рэканструкцыі набярэжнай паласы Мухаўца ў цэнтры горада ўпершыню падышлі яшчэ ў 2014 годзе. І ўжо да тысячагоддзя Брэста, якое мы адзначылі ў верасні 2019 года, гэты ўчастак уздоўж ракі стаў надзвычай прывабным і запатрабаваным месцам для прагулак і адпачынку. Тут сталі з'яўляцца крэатыўныя зоны, аб'екты, цікавосткі. Калі адкрылі эксклюзіўны сонечны гадзіннік, ён адразу палюбіўся гараджанам і гасцям усіх узростаў. А літаральна праз год побач з'явіўся сад бесперапыннага цвіцення з рознымі, нават даволі экзатычнымі, раслінамі. Гараджан прыцягваюць дзіцячыя пляцоўкі, побач з якімі абавязкова ёсць лаўкі для дарослых, спартыўныя пляцоўкі для актыўнага адпачынку. Па прыгожай добраўпарадкаванай набярэжнай цяпер можна дайсці да Гарадскога саду. Варта адзначыць, што пасля святкавання юбілею горада рэканструкцыя не спынілася, але атрымала працяг.

Апошняя, пятая чарга пераўтварэння, з тых, што былі запланаваныя праграмай развіцця горада, блізіцца да завяршэння. Здача аб'екта прызначана на красавік. Будаўніцтва вядзе філіял Будтрэста № 8. Будаўнікі завяршаюць работу на ўчастку, які заўсёды быў закрыты для праходу — паміж ЦЭЦ і старым рачным портам. Паводле інфармацыі **прараба названай арганізацыі Сяргея ЛУЦКАГА**, работу па рэканструкцыі пятай чаргі працягласцю 585 метраў яны распачалі летась у лістападзе. Участак пралягае аж да Брэсцкай крэпасці і выводзіць да Музея паравозаў. Па сутнасці, гэта было новае будаўніцтва. Уладкаваны пешаходная і веласіпедная дарожкі, пракладзены сеткі сувязі, ліўневая каналізацыя. Давялося таксама рабіць вынас водаправода, іншых інжынерных камунікацый, гэтую работу правялі спецыялісты водаканала. Вакол тэрыторыі рачнога порта ўстаноўлена агароджа, зроблена вулічнае асвятленне. Цяпер ідзе ўстаноўка малых архітэктурных формаў, тут з'явіцца зручныя для адпачынку лаўкі. Вядома, будуць пасаджаны дрэвы і кусты.

Побач з будаўнікамі ўжо шчыруюць камунальнікі: высаджваюцца кветкі, дасяваецца газонная трава, ідзе абрэзка дрэў. Неўзабаве будзе змантыравана прыстасаванне для паркоўкі веласіпедаў.

Цікава, што гэтую тэрыторыю ніхто не асвойваў — месцамі з даваенных, месцамі з паслявоенных часоў. Таму будаўнікам давялося займацца дэмантажом вузкакалейкі і падмуркаў прыкладна стагадовай даўнасці. Вельмі ўважліва паставіліся яны да тэрыторыі, якая ўваходзіла ў так званы Аб'ект 802. Справа ў тым, што ў савецкі час паблізу быў пункт перагрузкі ўранавай руды. Аб'ект ліквідавалі, правялі рэкультывацыю ў нулявых гадах. Але праверка на ўзровень радыяцыі, вядома, не перашкодзіла б. Таму замеры былі зроблены, прыборы, як засведчылі спецыялісты, ніякіх адхіленняў не зафіксавалі. Напамін пра былы аб'ект захоўвае толькі зямля: глеба тут мае непрывычна бурае адценне. Галоўнае, падкрэсліваюць будаўнікі, што эколагі вынеслі вердыкт аб бяспечнасці тэрыторыі.

Варта сказаць, спецыфіку гэтаму ўчастку набярэжнай надае Брэсцкая ЦЭЦ. Аб'ект гэты, зразумела, асаблівы, ён мусіць быць за глухой бетоннай сцяной. Дык вось, нейтралізаваць уражанне ад гэтай сцяны вырашылі жывой зялёнай агароджай. Яшчэ летась тут высадзілі кусты бэзу і дзёрану, а таксама ліяны дзявочага вінограду. Бэз хутка парадуе квеценню, а іншыя расліны — лістотай.

Пакуль ідуць работы, у некаторых месцах прыбярэжная паласа выглядае даволі голай. Але хутка тут з'явяцца новыя пасадкі хвойных дрэў, радамі стануць маладыя ліпы. Ва ўпраўленні архітэктуры і горадабудаўніцтва гарвыканкама падкрэсліваюць, што асобныя куточкі набярэжнай стануць сапраўды непаўторнымі. Напрыклад, з зоны саду бесперапыннага цвіцення з магноліямі, рабінамі, бярозамі Юнгі, паўлоніямі, пра які ўжо гаварылася, на ходу руху трапляюць фактычна ў змяшаны лес. А там ёсць «паляна», утворана экапліткай, пляц жа паміж штучнымі камянямі засыплюць чарназёмам і засеюць травой. Далей наведвальнік звычайна рухаецца ў бок Гарадскога саду, стагадовага парку, які таксама нядаўна быў вернуты ў гарадское асяроддзе фактычна з небыцця і стаў зонай ціхага адпачынку.

Разам з абноўленым участкам працягласць набярэжнай складзе тры кіламетры. Іх можна няспешна пераадолець пехатой ад бульвара Шаўчэнкі аж да Брэсцкай крэпасці, а можна праехаць на веласіпедзе. У гарадской улады ёсць задумка прадоўжыць добраўпарадкаванне ў заходнім кірунку аж да Заходняга абходу, а ва ўсходнім — да Суворaўскага моста. Але гэта — у перспектыве.

А пакуль горад рыхтуецца да ўрачыстага адкрыцця новага аб'екта — пятай чаргі рэканструкцыі, якая запланавана на 1 мая. У гэты ж дзень адбудзецца прэзентацыя ўсёй набярэжнай ракі Мухавец, якая перажыла маштабную рэканструкцыю і стала ўлюбёным месцам для многіх гараджан.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Обществу с ограниченной ответственностью
«РОДАНАГРОСЛОНИМСКИЙ»
Слонимского района Гродненской области, работающему в направлении современного сельского хозяйства,

НА ПОСТОЯННУЮ РАБОТУ ТРЕБУЕТСЯ:

АГРОНОМ, ЗООТЕХНИК

Требования: высшее профильное образование, опыт работы в сельском хозяйстве, готовность и желание обучаться. Дисциплинированность, инициативность, исполнительность, умение работать с большим объемом информации, умение организовать и координировать работу, желание работать на результат, высокий уровень личной ответственности.

Предлагаем:
- Работу в современной компании с иностранным капиталом;
- Трудоустройство согласно ТК РБ.
- Достойную оплату труда: 2 000 – 4 000 руб. (уровень предлагаемой зарплаты: оклад + премиальные выплаты по результатам работы. Итоговая зарплата будет определена по результатам собеседования).
- Возможность обучения в лучших сельскохозяйственных организациях страны и за рубежом (ЕС).
- Возмещение расходов по найму жилого помещения.
- Система мотивации получения результатов труда.
- Корпоративная безлимитная мобильная связь.
- Социальный пакет согласно коллективного договора.

Контакты:
Резюме отправлять на e-mail: mp@rodanagro.com
тел. +375 (33) 399-38-60
+375 (29) 318-22-65
(отдел кадров)
УНП 592000776

Обществу с ограниченной ответственностью
«РОДАНАГРОСЛОНИМСКИЙ»
Слонимского района Гродненской области, работающему в направлении современного сельского хозяйства,

НА ПОСТОЯННУЮ РАБОТУ ТРЕБУЕТСЯ:

ТРАКТОРИСТ-МАШИНИСТ СЕЛЬСКОХОЗЯЙСТВЕННОГО ПРОИЗВОДСТВА

Требования: опыт работы на энергонасыщенных тракторах, дисциплинированность, инициативность, исполнительность, ответственность, желание работать на результат, высокий уровень личной ответственности.

Предлагаем:
- Работу в современной компании с иностранным капиталом;
- Трудоустройство согласно ТК РБ.
- Достойную оплату труда: 2 000 – 4 000 руб. (уровень предлагаемой зарплаты: оклад + премиальные выплаты по результатам работы. Итоговая зарплата будет определена по результатам собеседования).
- Возможность обучения в лучших сельскохозяйственных организациях страны и за рубежом (ЕС).
- Возмещение расходов по найму жилого помещения.
- Система мотивации получения результатов труда.
- Корпоративная безлимитная мобильная связь.
- Социальный пакет согласно коллективного договора.

Контакты:
Резюме отправлять на e-mail: wp@rodanagro.com
тел. +375 (29) 935-70-20
+375 (29) 318-22-65
(отдел кадров)
УНП 592000776

Кіно на выхадныя

Усё змяніла выпадковая сустрэча

Эльдара Разанава кінаманы ведаюць як рэжысёра кінастужак «Службовы раман», «Дзяўчына без адрасу», «Карнавальная ноч», «Іронія лёсу, ці З лёгкай парай», «Сцеражыся аўтамабіля» і іншых фільмаў, што сталі сапраўднымі шэдэўрамі савецкай кінакласікі. І сёлета спаўняецца якраз 40 гадоў, як свет убачыла камедыйная меладрама майстра «Вакзал для дваіх».

Над сцэнарыем фільма Разанаў працаваў сумесна з Эмілем Брагінскім, у аснову стужкі яны паклалі дзве рэальныя гісторыі. ...Лёс бывае наравісты, але ніколі не варта страчваць надзею. Маскоўскі піяніст Максім Рабінін сустракае каханне ў самы няспросты перыяд свайго жыцця, калі, узяўшы на сябе віну жонкі, павінен паўстаць перад судом. Але спярша мужчына едзе развітацца з бацькам. На адной са станцый ён выходзіць перакусіць, а пасля з-за спрэчкі з афіцыянткай адстае ад цягніка...

Гісторыю кахання, якое ўзнікае насупер ак шматлікім перашкодам, народжаным рознасцю прафесій і характараў, абумоўленай жыццёвымі абставінамі, на экране ўвасабляе акцёрскі дуэт Людмілы Гурчанкі і Алега Басілашвілі. Выканаўцы галоўных роляў пазнаёміліся за дзве гадзіны да пачатку здымачнага працэсу, а калі фільм адзнялі, то яны ўжо былі як родныя. Таксама ў акцёрскім складзе — Нона Мардзюкова, Анастасія Вазнясенская, Аляксандр Шырвінт, Мікіта Міхалкоў і іншыя вядомыя артысты. А ролю намесніка начальніка вакзала сыграў сам рэжысёр.

«Вакзал на дваіх» стаў найлепшым па апытанні часопіса «Савецкі экран» у 1983 годзе, рэжысёр за яго атрымаў Дзяржаўную прэмію СССР, а Людміла Гурчанка — званне народнай артысткі СССР. Дарэчы, спачатку задумвалі фільм аднасерыйным, але з-за шматлікіх імправізацый ён стаў двухсерыйным. І сёння яго праглядаеш з асалодай. Не прапусціце кінасеанс на «Беларусь 3».

Алена ДРАПКО.

ШАШКІ («Звязда»)

Выпуск № 162

З 10 да 20 сакавіка ў Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі па шахматах і шашках праходзілі чэмпіянаты Беларусі па шашках-100 сярод жанчын і мужчын.

Перамаглі майстры Вікторыя Нікалаева і Андрэй Валюк.

«Асілкам завуся нездарма — дзесяцярых адным ударам». Пад такім дэвізам саставіў першыя дзве кампазіцыі Дзмітрый Камчыцкі з Магілёва.

№ 39



№ 39

Белыя простыя: e1, h2, b6 (3).

Чорныя простыя: b2, f2, g3, b4, d4, f4, c5, e5, g5, e7, g7 (11).

№ 40

Белыя простыя: d2, h2, b6, дамкі: a7, c7 (5).

Чорныя простыя: b2, f2, g3, b4, d4, f4, c5, g5, e7, g7, дамкі: a5 (11).

Наступныя кампазіцыі складзеныя вядучым аддзела.

№ 41

Белыя простыя: f2, g3, b4, d4, a5, c5, d6 (7).

Чорныя простыя: h2, a3, e3, f6, d8, f8 (6).

№ 42

Белыя простыя: a1, f2, h2, h4, a5, f6, g7 (7).

Чорныя простыя: d2, c3, b4, d4, f4, g5, d6, e7, d8 (9).

Астатнія кампазіцыі складзеныя па правілах бразільскіх шашак.

№ 43

Белыя простыя: b2, h2, f4, d6, c7 (5).

Чорныя простыя: c3, d4, h6, g7, f8 (5).

№ 44

Белыя простыя: c1, b2, f2, c3, f4, h4, f6, a7 (8).

Чорныя простыя: a3, e3, c5, b6, d6, h6, b8 (7).

№ 45

Белыя простыя: b2, d2, f2, c3, e3, a5, h6 (7).

Чорныя простыя: a3, h4, e5, c7, h8 (5).

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Праверце свае рашэнні

Выпуск № 161 ад 18.03.2022.

№ 32 1. ef2 ed2 2. c:g5 ab4 3. a:e7 d:h4 4. gf4 e:e1 5. gf2 e:g3 6.h:f4 x

№ 33 1. ef2 a:e3 2. f:b6 a:c7 3. hg3 h:f2 4. g:e3 cd6 5. e:c7 g:g3 6. ef4 g:e5 7. gf6 e:g7 8. cd8 x

№ 34 1. 37-31 26:28 2. 43:23 18:29 3. 30-24 29:20 4. 25:03 12-17 5. 03-14 04-09 6. 14:03 21-26 7. 03:21 26:17 8. 36-31 17-22 9. 31-27 22:31 10. 46-41+

№ 35 1. 48-42 38:18 2. 36-31 26:39 3. 40-34 39:30 4. 35:22 + ПР: 1. 40-34 38:18 2. 36-31 26:37 3. 48-42 37:30 4. 35:22 x (знайшоў С. Бурко)

№ 36 1. 46-41 37:46 2. 26:37 46:30 3. 25:43 42-47 4. 48-42 47:49 5. 50-44 49:40 6. 45:34 35-40 7. 34:45+

№ 37 1. f6-g7 h8:h4 2. f4-g5 h6:d2 3. f2-g3 h4:f2 4. g1:a7 d8:b6 5. a7:c5+

№ 38 1. g5-f6 e7:e3 2. h2:b4 a7:c5 [2... a3:c5 3. a1:c3 c5-d4 4. e5-d6 (4. c3-b4 a7:a3 5. e5:c3 a3-b2) 4...a7:e7 5. c3:e5 e7-f6] 3. a1:c3 c5-d4 4. e5-d6 a3:e7 5. c3:e5+

Першымі дакладныя адказы даслалі: С. Рашэцін (Ашмяны), С. Бурко (Орша), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), У. В. Дударэвіч (Брэсцкая вобл., Баранавіцкі р-н, в. Новая Мыш), А. Галаванаў, П. і В. Шульгі (усе — Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Каменец), І. Ананіч (Гродна), В. Ваўчкоў (Маладзечна).

Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru.

Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.

Сядзі і глядзі

СТВАРЫЦЬ І НЕ СТРАЦІЦЬ САМОГА СЯБЕ

«Гармонія дасягаецца толькі шляхам нейкіх сутыкненняў, канфлікта ў, яе нараджае хаос. І перавага чалавека ў тым, каб урэгуляваць яго, іначай дабіцца спакою, гармоніі немагчыма...» — сцвярджаў рэжысёр Андрэй Таркоўскі, 90-гадовы юбілей якога сёлета адзначыць кінематаграфічны свет. У эфіры «Беларусь 3» напярэдадні дня нараджэння рэжысёра, сцэнарыста і народнага артыста Расіі пакажуць адзін з яго знакавых фільмаў — гістарычную кінадраму «Андрэй Рублёў» (1966).

...Русь пачатку XV стагоддзя. Краіну раздзіраюць княжацкія міжусобіцы. Набегі татар, голад і мор пераследуюць народ. У гэтую трагічную эпоху з'яўляецца вялікі жывапісец Андрэй Рублёў. Звесткі пра яго мізэрныя і адрывістыя. І толькі нямногія тварэнні геніяльнага майстра дайшлі да нас. Задума кінастужкі, як адзначаў Таркоўскі, звязана з праблемай творчасці, з патрабаваннямі, абавязковымі для мастака, — бачыць і знайсці выхад, сілы для стварэння прыгожага, нягледзячы на складанасць жыцця, здолець выпакутаваць, стварыць самога сябе.

Фільм падзелены на восем навел і ахоплівае перыяд з 1400 да 1423 года. Андрэй Рублёў, вандроўны манах, з двума братамі — Данііламі і Кірылам — адпраўляецца ў вандроўку па рускіх землях. Падчас гэтых падарожжаў ён сутыкаецца на сваім шляху з арыштамі мірных грамадзян, жорсткасцю і бяспраўем, бачыць шмат гора і суму. Ён расчараваны і пачынае сумнявацца: ці патрэбны ўвогуле яго іконы людзям, якія жывуць у такіх абставінах?

Варта адзначыць, што яшчэ на этапе напісання сцэнарыя рэжысёр вёў доўгую працу ў архівах, каб лепш вывучыць старажытнарускі побыт, рамёствы, дзяржаўную палітыку і лёсы людзей таго перыяду. Аднак улічваючы, што фільм мастацкі, то (як адзначалі даследчыкі) месцамі ўсё ж засталася недакладнасць, якую можна спісаць на фантазію рэжысёра. Паколькі ідэяй будучай карціны Таркоўскі абавязаны Васілю Ліванаву, то акцёр разлічваў і на галоўную ролю. Аднак рэжысёрскае рашэнне на гэты конт было іншае. І ўвасабляць галоўнага персанажа выпала Анатолю Саланіцыну. Каб наблізіцца да вобраза іканапісца і праўдзіва сыграць Андрэя Рублёва, які некалькі гадоў трымаў абет маўчання, Саланіцын таксама маўчаў некалькі месяцаў падрыхтоўкі да здымак.

Не абышлося без «ахвяр дзеля мастацтва» і з боку некаторых іншых дзеючых асоб. Так, напрыклад, ключар Патрыкей (яго ўвасобіў Юрый Нікулін) — рэальны персанаж. Ён падчас набегу татар хаваў царкоўныя каштоўнасці і нават пад допытам не раскрываў іх месцазнаходжанне. Роля для акцёра была складаная як псіхалагічна, так і фізічна. Здымаючы сцэну, у якой Патрыкею паляць твар, рабілі гэта акуратна, каб не апячы Нікуліна. Пасля заканчэння здымак рэжысёр пахваліў акцёра, адзначыўшы, што той вельмі натуралістычна крычаў і нават у вачах быў сапраўдны боль. Аказалася, прычынай таму — гарачая салярка, якая трапляла на ногі акцёра. А вось Мікалаю Бурляеву ў эпізодзе, дзе яго герой шукае гліну, давялося добра памерзнуць напрыканцы кастрычніка, пакуль з шасці дубляў знялі тое, чаго патрабаваў фільм. Увогуле, здымкі праходзілі ў розных лакацыях сярод сапраўдных помнікаў архітэктуры XIV—XV стст. Уладзіміра, Суздаля, Пскова і іншых гарадоў. Здымалі і на тэрыторыі Андронікава манастыра ў Маскве, дзе правёў свае апошнія гады Андрэй Рублёў.

У 1978 годзе, па апытанні кіназнаўцаў, фільм «Андрэй Рублёў» увайшоў у 100 найлепшых карцін свету. Але вось яго шлях на вялікі экран быў няпросты. Калі рэжысёр здаў першы варыянт адзнятага матэрыялу, то меркаванні ў экспертаў аказаліся супярэчлівыя. Партыйнае кіраўніцтва палічыла, што фільм атрымаўся антынародны. Пачаліся патрабаванні аб унясенні шэрагу правак, і справа з выхадам зацягнулася. Праз нейкі час Андрэй Таркоўскі проста перастаў хадзіць на пасяджэнні мастацкага савета на сваім фільме. А пасля кінастужку выкупіў французскі бізнесмен рускага паходжання і павёз яе на Канскі кінафестываль (1969 г.), дзе «Андрэй Рублёў» атрымаў прыз міжнароднай асацыяцыі кінакрытыкаў. Таму абавязкова паглядзіце фільм, каб самім ацаніць майстэрства і ўшанаваць памяць вялікага рэжысёра.

Алена ДРАПКО.

«Са «Звяздою» — спадручней!»

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на II квартал або на I паўгоддзе 2022 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 12 красавіка 2022 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А.

Сярод падпісчыкаў будуць разыграны 7 прасаў Holt HT-IR-010 і суперпрыз — пыласос Samsung VCC4131S3A/XEV. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 26 красавіка 2022 года.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 30 чэрвеня 2022 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на II квартал або на першае паўгоддзе 2022 года і пашпарта. Пасля 30 чэрвеня 2022 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні чытайце ў нумары 41 ад 1 сакавіка 2022 года.

14.45, 21.30, 2.05 «Уральскія пельмені» (16 +).
16.05 Серыял «Міша псуе ўсё» (16+).
17.00 «Суперліга» (16+).
18.20 Серыял «Пастукай у мае дзверы» (16+).
22.15 Камедыя «Пара з будучыні» (16+).

0.00 Трылер «Цемра» (16+).
3.20 Серыял «Кадэцтва» (12+).
4.55 «6 кадраў» (16+).

Культура

6.30, 7.00, 7.30, 8.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...»
7.05 Легенды сусветнага кіно.
7.35 «Кроў кланаў». Дак. фільм [СЦ].
8.35, 16.45 «І гэта ўсё пра яго». Маст. фільм [СЦ].
9.45 «Першыя ў свеце». Серыял.
10.15 «Новы Гулівер». Маст. фільм.
11.35, 16.15 Раман у камені.
12.00 Адкрытая кніга. [СЦ].
12.35 «Продкі нашых продкаў».
13.20 Улада факта.
14.00 «Забытае рамяство».
14.15 «Люстэрка» для рэжысёра». Дак.фільм [СЦ].
15.05 Лісты з правінцыі [СЦ].
15.35 «Энігма. Герберт Блумстэдт».
17.55 Сяргей Рахманінаў. Выбраныя сачыненні.
18.45 «Квіток у Вялікі».
19.45 «Смеханастальгія».
20.15 Лінія жыцця [СЦ].
21.15 «Іванава дзяцінства». Маст. фільм [СЦ].
22.45 «2 Вернік 2».
0.00 «Малы Джо». Маст. фільм.
1.55 Шукальнікі.
2.40 «Перш мы былі птушкамі». М/ф для дарослых.

Настальгія

6.00 «Спяем, сябры!» (12+)
7.00 Маст. фільм «Якая цудоўная гульня» (18+).
8.25, 9.40, 11.00, 15.40, 17.00, 19.05, 20.40, 21.40, 23.40, 0.50, 2.35, 3.40, 5.00 Музычная настальгія (12+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР».
12.00 «Эліта Краіны Саветаў» (16+).
12.55 Мастацкі фільм «Жонка Сталіна» (18+).
18.00 «Да і пасля...» (16+)
19.20 Мастацкі фільм «Насця» (18+).
22.00 «Колба часу» (16+).
23.00 «Блеф-клуб» (16+).
0.00 «Быў час» (16+).
1.20 Маст. фільм «Руская рулетка» (18+).

EuroSport 1

0.55, 20.50 Навіны (16+).
1.00, 6.00, 12.00, 15.00, 16.30, 20.00 Веласпорт. «Тур Краіны Баскаў» (16+).
2.30 Тэніс. Australian Open. Мужчыны (6+).
4.00, 9.30, 13.30, 21.00 Дартс. Чэмпіянат свету WDF (6+).
7.30 Кёрлінг. ЧС. Мужчыны. Канада — Швецыя (6+).
11.30 Тэлечасопіс Discovery Golf (6+).
18.30 Веласпорт. Тур Фландрыі. Мужчыны (16+).
20.55 The Minute (16+).

Кінакамедыя

1.00 Памяняцца месцамі (16+).
3.05 Гэты шалёны, шалёны, шалёны свет (6+).
6.05 Паліцэйскі з Беверлі-Хілз-2 (16+).
8.00 Паліцэйскі з Беверлі-Хілз-3 (16+).
9.55 Мядовы месяц у Лас-Вегасе (16+).
11.40 Адпетыя ашуканцы (16+).

13.45 Больш чым секс (16+).
15.45 Аднакласнікі (12+).
17.40 Кароль вечарынак 2 (16+).
19.30 Шосты гулец (12+).
21.30 Руковая Пантэра-2 (12+).
23.10 Бландзінка ў законе (12+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
9.35 «Громавы» (16+).
10.25, 4.00 «Паглядзім» (12+).
10.55 «Поўня». Серыял (16+).
12.05, 1.45 «Містычныя гісторыі» (16+).
13.00, 1.15 «Любоўная магія» (16+).
13.30, 18.05, 2.30 «Сляпая» (16+).
14.25, 19.00, 3.15 «Варажбітка» (12+).
15.20 «Апакаліпсіс» (16+).
16.15, 0.30 «Гарадскія легенды» (16+).
17.10 «Ведзьмакі свету» (16+).
19.55 «Хаціка» (16+).
21.35 «Адважнае сэрца» (16+).
4.30 «Суд ідзе». Серыял (16+).

ТБ1000

6.00, 6.40, 17.20, 18.10 Доктар Хаус (16+).
7.45 Воблачна, магчымыя асадкі ў выглядзе фрыкадэлек (6+).
9.15 Воблачна, магчымыя асадкі: помста ГМА (6+).
10.55 Кароль гаворыць! (16+)
13.00 Гісторыя Дэвіда Каперфілда (12+).
15.10 Мільянер з трушчоб (16+).
19.00 Трансформеры (12+).
21.30 Трансформеры: помста паўшых (16+).
0.05 Трансформеры-3: цёмны бок Месяца (16+).
2.40 Вораг каля брамы (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.30, 12.20 Ёлкі новыя (6+).
7.25, 13.45 Ёлкі апошнія (6+).
9.05 Выратуйце Колю! (12+)
10.45 Дзяўчаты бываюць розныя (16+).
15.25 Гучная сувязь (16+).
17.10, 17.35, 18.05, 18.30 Апошні з Магікян (12+).
19.00 Каханне ў вялікім горадзе (16+).
20.30 Каханне ў вялікім горадзе-2 (16+).
22.10 Каханне ў вялікім горадзе-3 (12+).
23.35 Міфы (16+).
1.10 Усё пра мужчын (16+).
2.20 Стэндап пад прыкрыццём (16+).
4.00 Гараскоп на ўдачу (12+).

National Geographic

6.00 Навуковыя глупствы (16+).
6.35, 7.25 Неверагодны доктар Пол (16+).
8.15, 9.10 Інстынкт выжывання (16+).
10.00, 10.55 Аўта-SOS (16+).
11.45 Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
12.35 Дзікі тунец (16+).
13.20, 14.15, 19.15, 20.05 Расследаванні авіякатастроф (16+).
15.00, 15.55, 2.15, 3.00 Космас: магчымыя сусветы (16+).
16.45 Злавіць кантрабандыста (16+).
17.40 Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).
18.30, 18.50, 5.20, 5.35 Гульні розуму (16+).
21.00, 3.45 Галандская берагавая ахова ў Карыбскім моры (16+).
21.50, 0.25, 1.15 Служба бяспекі аэрапорта (16+).
22.40, 23.35 Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
4.30 Найцяжэйшы ў свеце рамонт (16+).

Discovery

8.00, 7.35 Як гэта ўладкавана? (12+)
8.25, 16.40, 22.10 Махінатары (12+).
9.20, 9.45, 20.20, 20.45 Багажныя войны (12+).
10.15, 21.15 Як гэта зроблена? (12+)
11.10 Хуткія і гучныя (12+).
12.05, 13.00 Залатая ліхаманка (16+).
13.55 Бітвы за кантэйнеры (16+).
17.35 Вулічныя гонкі (16+).
18.30 Іржавая імперыя (12+).
19.25, 4.27 Паміж небам і зямлёй (16+).
23.05, 5.14 Загадка ранча Блайнд-Фрог (16+).
0.00, 6.01 Дарожныя каўбоі (12+).
0.55, 6.48 Бітва пітмайстраў (12+).
1.50, 2.45, 3.40 Смяротны ўлоў (18+).

У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

Беларусь 1

6.00, 7.30, 8.30 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.20, 8.20 Навіны эканомікі.
7.25, 8.25, 18.15 Зона Х (16+).
9.10 Серыял «След» (16+).
10.45, 0.45 «Скажынемаўчы».
11.45, 12.10, 13.05, 18.45, 19.20 Драма «Міленькі ты мой» (12+).
14.00 «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ]
14.45, 15.25 Драма «Мама Лора» (12+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Дача (12+).
17.30 Існасць [СЦ].
21.00 Панарама.
21.45 Клуб рэдактараў (16+).
22.50 Серыял «Сельскі дэтэктыў». Фільм «Забойства на Івана Купалу» (12+).
0.30 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 18.20 Тэлебарометр.
9.05 Серыял «Сляпая» (16+).
10.00 «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
10.50 Серыял «Такая работа» (16+).
12.20 «Сямейныя гісторыі» (16+) [СЦ].
12.50 Серыял «Доктар Надзея» (16+).
13.40 Камедыя «Доктар Дуліт-4» (12+).
15.05 «Камень, нажніцы, папера» (16+).
15.30 Анімацыйны серыял «Качыныя гісторыі» (0+).
15.55 Нічога сабе ньюз (12+).
16.00 «ПІН_КОД» (12+).
16.55 «Вежа» (12+).
17.40 М/с «Кузуркі» (0+).
18.25 «На нажах» (16+).
19.20 «Гаспадыня лёсу». Серыял (16+).
20.10, 21.15 «Тата папаў» (16+).
21.10 Спортлато 5 з 36, КЕНА.
22.20 «Амаль былыя» (16+).
0.00 «Багіня шопінгу. Бітва бландзінак» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35 «Беларуская кухня».
8.05, 12.00, 16.05, 20.30, 23.40 Навіны культуры.
8.15, 17.55 «Шуранава і Хачынскі. Лэдзі і бадзяга». Дак. фільм (12+) [СЦ].
9.05, 18.45 «Генерал». Маст. фільм (12+) [СЦ].
10.45 «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
11.00, 17.00 «Дом з лілеямі». Серыял (16+) [СЦ].
12.10 «Сіла веры».
12.40 «Наперад у мінулае».
13.00, 21.05 «Супрацьстаянне». Серыял (16+) [СЦ].
15.15 «Кадры жыцця».
16.15 «Сваімі словамі».
20.40 «Калыханка» (0+).
23.15 «Камертон».

Беларусь 5

7.00 Тэніс. WTA.
8.50 Футбол. Ліга Еўропы. Ліга канферэнцыі УЕФА.
10.45 Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. «Айнтрахт» (Германія) — «Барселона» (Іспанія).
12.40 Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. «Пік» (Венгрыя) — «Фленсбург» (Германія).
14.10 Валейбол. Чэмпіянат Беларусі. «Будаўнік» (Мінск) — «Шахцёр» (Салігорск).
15.55 Свет англійскай прэм'ер-лігі. Відэасапоніс.
16.25 Планета спорту.
16.45 Авертайм.
17.20 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Металург» (Жлобін) — «Шахцёр» (Салігорск).
19.30 Хакей. КХЛ. Заходняя канферэнцыя. ЦСКА (Масква) — СКА (Санкт-Пецярбург).
21.50 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Ньюкасл» — «Вулверхэмптан».
23.55 Плаванне. Чэмпіянат Беларусі.

АНТ

6.00, 7.10, 8.10, 9.10 «Наша раніца».
7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 [СЦ], **20.30** Нашы навіны.
10.00, 11.15, 0.00 Серыял «Серафіма цудоўная» (16+).
12.20 «Бесталковыя нататкі» (12+).
13.15, 16.45, 18.20 Інфармацыйны канал (16+).
16.20 «Трывожная кнопка» (16+).
21.10 «Удача ў прыдачу!» (12+)
21.15 Фільм «Водпуск летам» (12+).
22.55 «Што? Дзе? Калі» (16+).

СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
9.00, 23.55 «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
10.40 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.20, 0.45 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 23.10 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.40, 16.50 «Уцякач». Серыял (16+).
20.10, 23.05 «СТБ-спорт».
20.15 «Сталічныя падрабязнасці».
20.25 «Міншчына».
20.40 «Тайны Беларусі».
21.35 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).

МІР

5.00 Мастацкі фільм «Светлы шлях» (6+).
6.00 «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (12+).
6.25 Мастацкі фільм «Амерыканская дачка» (6+).
8.00, 10.20 Серыял «Свае» (16+).
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
10.10 «У гасцях у лічбы» (12+).
13.15 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.05, 16.15 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.10 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
17.20 Мастацкі фільм «Акселератка» (6+).
19.15 «Слабае звяно» (12+).
20.10 «Гульня ў кіно» (12+).
20.50 «Сусветныя гульні розуму» (12+).
21.25 Мастацкі фільм «Бландзінка за вуглом» (6+).
22.55 Мастацкі фільм «Гульня ў чатыры рукі» (12+).
0.35 Мастацкі фільм «Вясёлыя хлопцы».
2.00 Мультфільмы (0+).

РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Аб самым галоўным» (12+).
12.35 «Кропкі над і» (16+).
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.30 «60 хвілін» (12+).
17.30 Фільм «Не магу сказаць «бывай» (12+).
21.05 Фільм «Права апошняй ночы» (12+).
23.10 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

НТБ—Беларусь

6.05 «Астрапрагноз».
6.10, 7.25, 8.25, 16.35, 19.50, 22.35, 23.40 Сёння. Галоўнае.
6.15 Серыял «Масква. Тры вакзалы» (16+).
7.05 Сфера інтарэсаў.
7.40 «Зламаць стэрэатыпы» (12+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.35, 21.00 «НЗ.by».
8.55 Пракурорская праверка (16+).
10.35 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).
13.25 Надзвычайнае здарэнне.
13.55, 16.50 Баявік «Унутранае расследаванне» (16+).
18.05 «Чакай мяне» (12+).
20.10 «Следства вялі...» (16+)
21.30, 22.40 «Краіна талентаў» (12+).
23.55 Дакументальны цыкл «Вечная Айчынная» (12+).

8 канал

7.00, 15.30, 19.55, 21.10, 1.50 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 Мультпарад (0+).
7.30 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Серыял «Дзяцінства Шэлдана» (12+).
8.15 Серыял «Закінутыя ў космасе» (12+).
9.40 Серыял «Заблытаныя лёсы» (12+).
11.10 Серыял «Эквадор».
11.55 Серыял «Чукур» (16+).
13.25 Драма «Бойфрэнд з будучыні» (16+).
15.35 «Хачу ў кіно» (12+).
15.40 Мультпарад. «Дом Савы» (0+).
16.25 Серыял «Абацтва Даўнтан» (18+).
18.30 Камедыя «Жылі-былі» (12+).
20.00 Серыял «Эмігрант» (18+).
20.55 «Вечарніца» (0+).
21.15 Фільм-катастрофа «2012. Апакаліпсіс» (16+).
23.50 «Героі коміксаў на экране» (12+).

ВТБ

6.00 «Лаві момант» (16+).
7.00 «Раніца з гумарам» (16+).
10.45, 22.30 «КВЗ. Панашаму» (16+).
12.00 «Наш рамонт» (16+).
12.30 «Дурні і дарогі» (16+).
13.25 «Галілеа» (12+).
13.50 Серыял «Апошні з Магікян» (16+).
14.45, 18.40 Серыял «Госці з мінулага» (16+).
16.05 Серыял «Міша псуе ўсё» (16+).
17.00, 0.55 Серыял «90-я. Весела і гучна» (16+).
20.00 Серыял «Пагрукай у мае дзверы» (16+).
21.00 Прыгоды «Мой сябар дэльфін Рэха» (6+).
0.00 Серыял «Улётны экіпаж» (16+).
2.35 Серыял «Кадэцтва» (12+).
4.10 «Адна за ўсіх» (16+).
5.10 «6 кадраў» (16+).

Культура

6.30, 7.00, 7.30, 8.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...»
7.05 Легенды сусветнага кіно.
7.35, 18.35, 1.05 «Кроў кланаў». Дак. фільм [СЦ].
8.35, 16.35 «І гэта ўсё пра яго». Маст. фільм [СЦ].
9.50, 2.45 Колер часу.
10.15 «Назіральнік».
11.10, 0.00 XX стагоддзе.
12.20 Дарогі старых майстроў.
12.35 «Продкі нашых продкаў». Серыял.
13.20 Штучны адбор.
14.00 «Забытае рамяство».
14.15 «Андрэй Рублёў». Дак. фільм [СЦ].
15.05 Навіны. Падрабязна. Кіно.
15.20 «Біблейскі сюжэт».
15.50 «Белая студыя».
17.50, 2.00 Сяргей Рахманінаў. Выбраныя сачыненні.
19.45 «Галоўная роля».
20.05 «Абсалютны слых».
20.45 «Добрай ночы, малыя!».
21.00 «Салярыс». Ну вось, я цябе люблю». Дак. фільм [СЦ].
21.40 Улада факта.
22.25 «Варта». Маст. фільм.
23.10 «Афіша — дакумент гісторыі». Серыял [СЦ].

Настальгія

6.00 «СевАлогія» (18+).
6.55, 8.45, 9.40, 11.00, 12.50, 14.35, 15.40, 17.00, 20.25, 21.40, 23.00, 0.55, 3.40 Музычная настальгія (12+).
7.20 Мастацкі фільм «Мянялы» (18+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 0.00 «Народжаныя ў СССР».
12.00 «Быў час» (16+).
13.20 Маст. фільм «Русская рулетка» (18+).
18.00 «Спяем, сябры!» (12+)
19.00 Маст. фільм «Якая цудоўная гульня» (18+).
1.40 «Музычная гавань Элеаноры Філінай» (16+).
3.50 Мастацкі фільм «Стралец непрыкаяны» (18+).
5.20 «Блеф-клуб» (16+).

EuroSport 1

1.00, 6.00, 11.30, 15.00, 16.30, 20.00 Веласпорт. «Тур Краіны Баскаў» (16+).
2.30 Тэніс. Australian Open. Мужчыны (6+).
4.00, 9.30, 13.30, 21.00 Дартс. Чэмпіянат свету WDF (6+).
7.30 Веласпорт. Тур Фландрыі. Мужчыны (16+).
8.30 Тэлечасопіс «Зала славы: Пекін-2022» (16+).
11.25, 14.55 The Minute (16+).
13.00 Тэлечасопіс Cycling Show (16+).
18.30 Веласпорт. Гранпры Мігеля Індурайна (16+).
20.55 Навіны (16+).

Кінакамедыя

2.05 Адпетыя ашуканцы (16+).
4.05 Мядовы месяц у Лас-Вегасе (16+).
5.50 Залатое дзіця (16+).
7.35 Паездка ў Амерыку (18+).
9.50 Паліцэйскі з Беверлі-Хілз-3 (16+).
11.40 Памяняцца месцамі (16+).
13.55 Бландзінка ў законе (12+).
15.40 Бландзінка ў законе-2 (12+).
17.30 Больш за секс (16+).
19.30 Лёгкія паводзіны (16+).
21.15 Паліцэйскі з Беверлі-Хілз-2 (16+).
23.10 Майкл (16+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
10.05 «Громавы» (16+).
10.55 «Перыскоп» (16+).
11.15 «Поўня». Серыял (16+).

12.15 «Містычныя гісторыі» (16+).
13.05, 17.25 «Любоўная магія» (16+).
13.35, 18.00 «Старац» (16+).
14.35, 19.35, 3.00 «Сляпая» (16+).
15.30, 20.35 «Варажбітка» (16+).
16.25 «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
19.00 «Уінджы» (12+).
21.35 «Сельскі дэтэктыў» (16+).
22.30 «З чаго пачынаецца Радзіма» (16+).
23.30 «Дзённік экстрасэнса» (16+).
0.25 «Лінія абароны» (16+).
0.55 «Гульні розуму» (16+).
3.50 «Развітанне» (16+).
4.30 «Суд ідзе». Серыял (16+).

ТБ1000

5.15, 5.55, 17.20, 18.10 Доктар Хаус (16+).
7.05 Баявы конь (12+).
9.45 Вораг каля варот (16+).
12.05 Выбар капітана Карэлі (16+).
14.20 Загадкавая гісторыя Бенджаміна Батана (16+).
19.00 Рамэа і Джульета (12+).
21.00 Яшчэ адна з роду Балейн (16+).
23.05 Версальскі раман (18+).
1.10 З любоўю, Розі (16+).
2.50 Куды прыводзяць мары (12+).

ТБ1000 Рускае кіно

6.40 8 першых спатканняў (16+).
9.10 8 новых спатканняў (12+).
10.40 8 лепшых спатканняў (12+).
12.15 Міфы (16+).
13.55 Усё пра мужчын (16+).
15.20 Стэндап пад прыкрыццём (16+).
17.10, 17.35, 18.05, 18.30 Апошні з Магікян (12+).
19.00 Пра што гавораць мужчыны (16+).
20.40 Пра што яшчэ кажуць мужчыны (16+).
22.25 Пра што кажуць мужчыны. Працяг (16+).
0.00 Жанчыны супраць мужчын (18+).
1.25 Ёлкі новыя (6+).
2.50 Ёлкі апошнія (6+).
4.20 1812: уланская балада (12+).

National Geographic

6.00, 5.35 Навуковыя глупствы (16+).
6.35, 7.25 Неверагодны доктар Пол (16+).
8.15, 9.10 Інстынкт выжывання (16+).
10.00, 10.55 Аўта-SOS (16+).
11.45 Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
12.35, 21.00, 21.50, 3.20 Дзікі тунец (16+).
13.25, 14.05, 19.15 Расследаванні авіякатастроф (16+).
15.00, 15.55, 1.50, 2.35 Космас: магчымыя сусветы (16+).
16.45 Неверагодныя цуды тэхнікі (16+).
17.40 Індыя з вышыні птушынага палёту (16+).
18.30, 18.50, 4.55, 5.15 Гульні розуму (16+).
20.10 Аляска: новае пакаленне (16+).
22.40, 23.30 Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
0.20, 1.10 Служба бяспекі аэрапорта (16+).
4.05 Найцяжэйшы ў свеце рамонт (16+).

Discovery

8.00, 1.50, 2.15, 2.45, 3.10, 3.40, 4.04, 7.35 Як гэта зроблена? (12+)
8.25, 16.40, 22.10 Махінатары (12+).
9.20, 9.45, 20.20, 20.45 Багажныя войны (12+).
10.15, 21.15 Як гэта зроблена? (12+)
11.10 Хуткія і гучныя (12+).
12.05 Як уладкаваны Сусвет (16+).
13.00 Давід Андрэс каляскіць па свеце (12+).
13.55 Брудная работка (12+).
14.50, 15.45 Грандыёзныя машыны Аляскі (12+).
17.35 Вулічныя гонкі (16+).
18.30 Іржавая імперыя (12+).
19.25, 4.27 Паміж небам і зямлёй (16+).
23.05, 5.14 Пчаліны кароль (12+).
0.00, 6.01 Голыя і напалоханыя (16+).
0.55, 6.48 У дзікіх умовах (12+).

У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

чацвер, 7 красавіка ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15, 0.00 Зона Х (16+).
8.50 Слова Мітрапаліта Веніяміна на свята Благавешчання Прасвятой Багародзіцы.
09.10, 22.15 Серыял «След» (16+).
10.45, 0.35 «Скажынемаўчы».
11.45, 12.10, 13.05, 18.35, 19.20 Драма «Міленькі ты мой» (12+).
14.00 «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ]
14.45, 15.25 Драма «Мама Лора» (12+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Беларускі час.
21.00 Панарама.
21.45 Адзін дзень (12+).
23.45 Сфера інтарэсаў.
0.20 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 18.15 Тэлебарометр.
9.05, 20.10 Серыял «Сляпая» (16+).
10.00, 23.35 «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
10.50, 22.05 Серыял «Такая работа» (16+).
12.20 «Сямейныя гісторыі» (16+) [СЦ].
12.50, 21.15 Серыял «Доктар Надзея» (16+).
13.35, 18.20 «Арол і рэшка. 10 гадоў» (16+).
14.30 «Камень, нажніцы, папера» (16+).
14.55 «Вось такія людзі» (12+).
15.10 Анімацыйны серыял «Качыныя гісторыі» (0+).
15.55 Нічога сабе ньюз (12+).
16.00 «ПІН_КОД» (12+).
16.55 «Вежа» (12+).
17.40 М/с «Кузуркі» (0+).
19.20 «Гаспадыня лёсу». Серыял (16+).
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНА.

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35, 12.10 «Беларуская кухня».
8.05, 12.00, 16.30, 20.30, 23.40 Навіны культуры.
8.15 «Размовы пра духоўнае».
8.25, 18.20 «Аляксандр Міхайлаў. У душы я ўсё яшчэ марскі воўк». Дак. фільм (12+) [СЦ].
9.05, 18.55 «Дзень камандзіра дывізіі». Маст. фільм (12+) [СЦ].
10.35 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
11.00, 17.20 «Дом з лілеямі». Серыял (16+) [СЦ].
12.40 «Наперад у мінулае».
13.00, 21.05 «Супрацьстаянне». Серыял (16+) [СЦ].
15.15 «Кадры жыцця».
16.05 «Кампазітары Беларусі».
16.40 «Сваімі словамі».
20.40 «Калыханка» (0+).
23.15 «Камертон».

Беларусь 5

7.00 Тэніс. WTA.
8.55 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Шахцёр» (Салігорск) — «Металург» (Жлобін) / Хакей. КХЛ. Заходняя канферэнцыя. ЦСКА (Масква) — СКА (Санкт-Пецярбург).
10.50 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. «Вільярэал» (Іспанія) — «Баварыя» (Германія).
12.45 Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. «Веспрэм» (Венгрыя) — «Вардар» (Паўночная Македонія).
14.20 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. «Чэлсі» (Англія) — «Рэал» (Мадрыд, Іспанія).
16.15 Хакей для ўсіх.
16.50 Хакей. КХЛ. Усходняя канферэнцыя.
19.20 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Юнацтва-Мінск» — «Нёман» (Гродна). / Валейбол. Чэмпіянат Беларусі. «Будаўнік» (Мінск) — «Шахцёр» (Салігорск).
21.50 Футбол. Ліга Еўропы. Ліга канферэнцый УЕФА. Анлайн гульнявога дня.
23.55 Плаванне. Чэмпіянат Беларусі.

АНТ

6.00, 7.15, 8.15 «Наша раніца».
7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 [СЦ], **20.30** Нашы навіны.
7.10, 8.10 «Трывожная кнопка» (16+).
9.10 «Аб'ектыўНа» (16+).
10.10, 11.15, 22.55 Серыял «Серафіма цудоўная» (16+).
12.20 «Бесталковыя нататкі» (12+).
13.15, 16.20, 18.20, 18.55 Інфармацыйны канал (16+).
18.50 «Удача ў прыдачу!» (12+)
21.15 «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
21.55 Серыял «Ніхто не даведаецца» (16+).
0.40 Час.

СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
9.00, 23.55 «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
10.40 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.20, 20.50, 0.45 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 23.10 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.40, 16.50 «Уцякач». Серыял (16+).
20.20, 23.05 «СТБ-спорт».
20.25 «Сталічныя падрабязнасці».
20.35 «Міншчына».
21.40 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).

МІР

5.00 Мастацкі фільм «Настаўнік» (6+).
5.40 «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (12+).
6.05, 10.10 Серыял «Уласік. Цень Сталіна» [СЦ] (16+).
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Навіны (Бягучы радок).
13.15, 18.00, 0.40 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.05, 16.15, 1.25 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.10, 2.10 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
17.10 «Міравое пагадненне» (16+).
19.25, 20.05 «Гульня ў кіно» (12+).
20.50, 21.40 «Слабае звяно» (12+).
22.30 «Назад у будучыню» (16+).
23.20 Серыял «Свае» (16+).
2.55 «Набытак рэспублік» (12+).
3.20 Мастацкі фільм «Светлы шлях» (6+).

РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Аб самым галоўным» (12+).
12.35 «Кропкі над і» (16+).
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.30 «60 хвілін» (12+).
17.30 Серыял «Земскі доктар» (12+).
21.05 Серыял «Лізавета» (16+).
22.10, 23.10 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).
0.40 Драма «Сафія» (16+).

НТБ—Беларусь

6.05 «Астрапрагноз».
6.10, 7.25, 8.25, 16.35, 19.50, 21.55, 23.10 Сёння. Галоўнае.
6.15 Серыял «Масква. Тры вакзалы» (16+).
7.05 Сфера інтарэсаў.
7.40 «Зламаць стэрэатыпы» (12+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.35, 22.00 «НЗ.by».
8.55 Пракурорская праверка (16+).
10.35 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).
13.25 Надзвычайнае здарэнне.
13.55, 16.45 Баявік «Унутранае расследаванне» (16+).
17.05 «За гранню» (16+).
18.00 «ДНК» (16+).
20.05, 22.20 Серыял «Чынгачгук» (16+).
23.30 Дэтэктыў «Метэарыт» (16+).
0.20 Дакументальны цыкл «Вечная Айчыннная» (12+).

8 канал

7.00, 15.45, 19.45, 21.10, 1.00 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 Мультпарад (0+).
7.30 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Серыял «Дзяцінства Шэлдана» (12+).
8.15 Серыял «Закінутыя ў космасе» (12+).
9.40 Серыял «Заблытаныя лёсы» (12+).
11.10 Серыял «Балівія».
12.35 Серыял «Чукур» (16+).
14.05 Камедыя «Людзі ў чорным» (12+).
15.50 «Хачу ў кіно» (12+).
15.55 Мультпарад. «Дом Савы» (0+).
16.15 Серыял «Абацтва Даўнтан» (18+).
18.10 «Гатуй як шэф» (12+).
18.20 «Смачнае кіно» (12+).
19.55 Серыял «Эмігрант» (18+).
20.50 «Вечарніца» (0+).
21.00 «Салам алейкум, Беларусь!»
21.15 Драма «Кітайскі квартал» (16+).
23.25 Серыял «Выхаваныя ваўкамі» (18+).

ВТБ

6.00 «Лаві момант» (16+).
7.00 «Раніца з гумарам» (16+).
10.45, 22.30 «КВЗ. Панашаму» (16+).
12.00 «Гатуем як шэф» (16+).
12.30 «Дурні і дарогі» (16+).
13.25 «Галілеа» (12+).
13.50 Серыял «Апошні з Магікян» (16+).
14.45 Серыял «Госці з мінулага» (16+).
16.05 Серыял «Міша псуе ўсё» (16+).
17.00, 0.55 Серыял «90-я. Весела і гучна» (16+).
18.40 «Уральскія пельмені» (16+).
20.00 Серыял «Пагрукай у мае дзверы» (16+).
21.00 Драма «Учёк з Фіёнай» (6+).
0.00 Серыял «Улётны экіпаж» (16+).
2.35 Серыял «Кадэцтва» (12+).
4.10 «Адна за ўсіх» (16+).
5.10 «6 кадраў» (16+).

Культура

6.30, 7.00, 7.30, 8.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40 Навіны культуры.
6.35 Лета Гасподняе. Благавешчанне Прасвятой Багародзіцы. [СЦ].
7.05 Легенды сусветнага кіно.
7.35, 18.35, 1.05 «Кроў кланаў». Дак. фільм [СЦ].
8.35, 16.35 «І гэта ўсё пра яго». Маст. фільм [СЦ].
9.50, 2.50 Колер часу.
10.15 «Назіральнік».
11.10 XX стагоддзе.
12.20 «Забытае рамяство».
12.35 «Продкі нашых продкаў». Серыял.
13.20 Лінія жыцця.
14.15 «Салярыс». Ну вось, я цябе люблю». Дак. фільм [СЦ].
15.05 Навіны. Падрабязна. Тэатр.
15.20 Пернікавы домік [СЦ].
15.45 «2 Вернік 2».
17.50, 2.00 Сяргей Рахманінаў. Выбраныя сачыненні.
19.45 «Галоўная роля».
20.05 Адкрытая кніга [СЦ].
20.30 Колер часу. Рэнэ Магрыт.
20.45 «Добрай ночы, малыя!»
21.00 «Люстэрка» для рэжысёра». Дак. фільм [СЦ].
21.40 «Энігма. Герберт Блумстэдт».
22.25 «Варта». Маст. фільм.
23.10 «Афіша — дакумент гісторыі». Серыял [СЦ].
0.00 «Шаман». Дак. фільм.

Настальгія

6.00 «Быў час» (16+).
6.50, 8.35, 9.40, 11.00, 14.25, 15.40, 17.00, 21.40, 23.00, 0.55, 2.45, 3.40, 5.00 Музычная настальгія (12+).
7.20 Маст. фільм «Руская рулетка» (18+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР».
12.00 «Спяем, сябры!» (12+)
13.00 Маст. фільм «Якая цудоўная гульня» (18+).
18.00 «Эліта Краіны Саветаў» (16+).
18.55 Мастацкі фільм «Жонка Сталіна» (18+).
0.00 «СевАлогія» (18+).
1.20 Мастацкі фільм «Мянялы» (18+).

EuroSport 1

0.55, 20.55 Навіны (16+).
1.00 Тэлечасопіс Discovery Golf (6+).
1.30, 6.00, 11.30, 16.30, 20.00 Веласпорт. «Тур Краіны Баскаў» (16+).
2.30 Тэніс. Australian Open. Жанчыны (6+).
4.00, 9.30, 13.35, 21.00 Дартс. Чэмпіянат свету WDF (6+).
7.30 Веласпорт. Гранпры Мігеля Індурайна (16+).
8.30 Тэлечасопіс «Зала славы: Пекін-2022» (16+).
13.00 Тэлечасопіс Discovery Golf (6+).
13.30 The Minute (16+).
15.00 Веласпорт. «Схелдэпрэйс» (16+).
18.30 Веласпорт. Тур Фландрыі. Жанчыны (16+).
19.30 Тэлечасопіс Cycling Show (16+).

Кінакамедыя

1.05 Дарагі тата (12+).
2.40 Пакуль вяселле не разлучыць нас (12+).
4.45 Мільянер паняволі (12+).

6.35 Паліцэйскі з Беверлі-Хілз (16+).
8.30 Злаві мяне, калі зможаш (12+).
11.10 Доктар Дулітл (12+).
12.40 Доктар Дулітл-2 (12+).
14.15 Няма чаго губляць (16+).
16.05 Лёгкія паводзіны (16+).
17.50 Выкідала (18+).
19.30 Забойны футбол (16+).
21.25 Паліцэйскі з Беверлі-Хілз-3 (16+).
23.20 Руковая Пантэра (12+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
9.50 «Громавы» (16+).
10.40 «Улецы» (12+).
11.10 «Поўня». Серыял (16+).
12.15 «Містычныя гісторыі» (16+).
13.10, 4.00 «Любоўная магія» (16+).
13.40, 18.05 «Старац» (16+).
14.40, 19.40, 3.10 «Сляпая» (16+).
15.35, 20.35 «Варажбітка» (16+).
16.30 «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
17.30 «Любоўная магія» (16+).
19.05 «Уінджы» (12+).
21.30 «Сельскі дэтэктыў» (16+).
22.25 «З чаго пачынаецца Радзіма» (16+).
23.25 «Дзённік экстрасэнса» (16+).
0.20 «10 самых» (16+).
0.50 «Пачатак» (16+).
4.30 «Суд ідзе». Серыял (16+).

ТБ1000

5.00, 5.40, 17.20, 18.10 Доктар Хаус (16+).
6.55 Яшчэ адна з роду Балейн (16+).
9.15 Рамэа і Джульета (12+).
11.15 Двухсотгадовы чалавек (6+).
13.35 Куды прыводзяць мары (12+).
15.35 Уладар стыхій (6+).
19.00 Мільянер з трушчоб (16+).
21.10 Гісторыя Дэвіда Каперфілда (12+).
23.15 Кароль кажа! (16+)
1.20 Загадкавая гісторыя Бенджаміна Батана (16+).
4.00 Прыстанак праклятых (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

6.40 Пра што гавораць мужчыны (16+).
8.45 Пра што гавораць мужчыны. Працяг (16+).
10.25 Пра што яшчэ гавораць мужчыны (16+).
12.10 Навагодні перапалох (12+).
13.40 Гараскоп на ўдачу (12+).
15.20, 3.10 Гудбай, Амерыка (12+).
17.10, 17.35, 18.05, 18.30 Апошні з Магікян (12+).
19.00 Гучная сувязь (16+).
20.45 Дзень радыё (16+).
22.30 Ёлкі апошнія (6+).
0.05 Дзяўчаты бываюць розныя (16+).
1.35 Выратуйце Колю! (12+)

National Geographic

6.00, 5.35 Навуковыя глупствы (16+).
6.15 Зрабіць за адзін дзень (16+).
6.35, 7.25 Неверагодны доктар Пол (16+).
8.20, 9.10 Інстынкт выжывання (16+).
10.00, 10.55 Аўта-SOS (16+).
11.45 Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
12.35, 16.50 Дзікі тунец (16+).
13.25, 14.15 Расследаванні авіякатастроф (16+).
15.05, 15.55, 1.55, 2.40 Космас: магчымыя сусветы (16+).
17.40 Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).
18.30, 18.50, 5.00, 5.25 Гульні розуму (16+).
20.10 Эпідэміі: ад эболы да каранавіруса (16+).
21.00, 21.50, 3.25 Злавіць кантрабандыста (16+).
22.40, 23.35 Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
0.25, 1.10 Служба бяспекі аэрапорта (16+).
4.10 Найцяжэйшы ў свеце рамонт (16+).

Discovery

8.00, 13.55, 14.20, 14.50, 15.15, 15.45, 16.10, 7.35 Як гэта зроблена? (12+)
8.25, 16.40, 22.10 Махінатары (12+).
9.20, 9.45, 20.20, 20.45 Багажныя войны (12+).
10.15, 21.15 Як гэта зроблена? (12+)
11.10 Хуткія і гучныя (12+).
12.05 Пчаліны кароль (12+).
13.00 Голыя і напалоханыя (16+).
17.35 Вулічныя гонкі (16+).
18.30 Іржавая імперыя (12+).
19.25, 4.27 Паміж небам і зямлёй (16+).
23.05, 0.00, 0.55, 5.14, 6.01, 6.48 Залатая ліхаманка (16+).
1.50 Бітвы за кантэйнеры (16+).

У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

ТОЙ, ХТО ПАЧАЎ, ЗРАБІЎ НЕ ПАЛОВУ?

Цётка Марыля — рэдкая руканадзельніца: каму світар звязаць, каму — шапку, спадніцу, сукенку... З усёй акругі заказы былі, а пасля выхаду на пенсію яшчэ і час з'явіўся — адвяла душу: уся хата — у палавічках ды сурвэтках, уся радня, сяброўкі, суседзі — у шкарпэтках, шаліках, рукавічках. Нешта з лішняга нават на базар майстрыха занесла, чужым прадала — усё ж дабаўка да пенсіі...

А тут па тэлевізары ўбачыла, што ў Амерыцы розныя абноўкі вяжуць не толькі для людзей: там... курэй апранаюць, і тады яны ўзімку не мерзнуць — нясуцца лепей... «Гэта ж трэба!», — здзівілася майстрыха. І адразу думкі ў галаву, што халады яшчэ патрымаюцца, што куратнік стары і ў маразы нясушкам, напэўна ж, холадна... А вось калі цёплыя рэчы звязаць, то, можа, і сапраўды аддзячаць — нейкі дзясятак «лішніх» яек знясуць...

Дзеля гэтага, умеючы, шмат працаваць не прыйшлося — некалькі вечароў пасядзела — і глядзіш, гатова: уся курыная чарада ў кофтачкі прыбралася (з проразямі для крылаў)... А трохі розных нітак засталося — дык яшчэ і кату абноўка перапала, бо ён, бедны, то кашляў зімой, то чхаў...

У Цімоха, Марылінага аднавяскоўца па мянушцы Пыжык, зусім іншае хобі было: апошнія гадоў мо з дзесяць цвярозым яго мала хто бачыў, а вось п'яным недзе пад плотам ці кустом — вельмі многія. Людзі тады рэдка яго чапалі, бо ведалі, што не захварэе і пакуль не прасцюца, наўрад ці ўстане...

Вось і ў тую халаднавату раніцу Цімох дадому не дапоўз — зрабіў «прывал» якраз каля Марыліных весніц. Згледзеўшы гэта, гаспадыня нацягнула яму на галаву шапку-аблавушку, што адкацілася ўбок, падсунула пад вуха старыя валёнкі. А калі сонейка засвяціла ярчэй — выпусціла на шпацыр сваіх нясушак...

І трэба ж — якраз у тую хвілін Пыжык, прадраўшы вочы, пачаў углядацца — спрабаваў зразумець, дзе ж ён?

Адказ на гэтае балючае пытанне дужа ўскладнялі жвавыя «бландзінкі» ў жоўтых, зялёных і сініх камізэльках, услед за якімі ішоў здаравенны певень — у ярка-чырвонай.

Пыжык, ашалелы ад такога відовішча («няўжо белая гарачка — славутая «вавёрачка»?), сяк-так прысеў, а калі прытуліўся да плота, на яго вельмі хворую галаву абрынуўся новы ўдар: са слупка, свечкай задраўшы хвост, саскочыў кот. І таксама ў камізэльцы — ярка-паласатай...

Сказаць, што пасля гэтага Пыжык завязаў — кінуў піць — будзе няпраўдай: ён толькі з тыдзень пратрымаўся, зусім не «ўжываў», пакуль цвярозым вокам не паглядзеў на тых модных Марыліных курэй. Потым, на жаль, зноў узяўся за сваё, праўда, куды радзей і ўжо з аглядкай. Ва ўсякім разе, як змяла больш не набіраўся, што для Пыжыка таксама прагрэс. Ды яшчэ які!

Алена Несцяронак,

г. Докшыцы.

МОВА, ЗРАЗУМЕЛАЯ ЎСІМ?

Наша цётка пра вайну расказваць не любіла. Яно і зразумела, бо прыемнага ў гэтых расказах мала... Весялілі нас хіба ўспаміны пра курэй ды карову. Звалі тую Краскай (мусіць, таму што ярка-рыжай была?). Але ж і хітрай таксама! Нейкім цудам, не іначай, ёй удалося адбіцца ад статка, уцячы ад немцаў; ноччу — прычым з вёскі за тры вярсты — знайсці дарогу дамоў, рогам адчыніць свой хлеў, каб потым, ледзь не ўсю вайну, ратаваць малаком многіх маленькіх вяскоўцаў.

А ўжо яны, тыя малыя, як расказвала цётка, ратавалі часам і вялікіх — дарослых.

...Калі ў чарговы раз у вёску ўварваліся немцы, ёй было сем, а сястрычцы — пяць. На печы сядзелі. У нешта гулялі. Пачулі ад дзвярэй грознае: «Матка, млека, яйка!» і ўбачылі трох фашыстаў.

— Паночкі мае, адкуль жа млека? — загаманіла мама. — Усіх каровак вашы забралі (апошнюю, Краску, людзі ў лесе хавалі). Куры таксама несціся перасталі...

— Што?! Сталін? — аж падскочылі ад злосці немцы.

— Так-так, далібог перасталі, — забажылася гаспадыня, з жахам бачачы, што адзін з фашыстаў дастае з кабуры пісталет, двое іншых нешта гяргечуць і ўсё паўтараюць: Сталін ды Сталін.

А ён жа — зусім ні пры чым!

— Захаладала ж, паночкі! Вось куры і не нясуцца. Яек няма... Даўно... Ніводнага! Дзеці галадаюць, — заламаўшы рукі, плакала маці.

І казала пры гэтым чыстую праўду: малыя сапраўды галадалі. Але ў тыя хвіліны аж заходзіліся ад страху: баяліся, што немцы могуць забіць іх маму. Таму з крыкам-плачам сіганулі з печы, памкнуліся да яе, абнялі і...

Цуд, можна сказаць, адбыўся: той, старшы з немцаў, пашкадаваў іх — схаваў пісталет, развярнуўся да дзвярэй сам. Следам за ім рушылі іншыя.

...Цётка казала, што яны, дзеці вайны, выжылі дзякуючы аднавяскоўцам, карове, а найперш, вядома ж, маме.

Мама — ва ўсякім выпадку, у той раз — выжыла дзякуючы ім.

М. Астапчук,

г. Магілёў.

«МАРАКІ» НЕ ЗДАЮЦЦА!

Марачкі — і пагатоў...

...Помню, знаёмая псіхолаг пасля чарговага тэсціравання абуралася: казала, што цяперашнія студэнты не ведаюць ні беларускага слова «цнота», ні рускага «целомудрие».

А па вялікім рахунку, чаму тут здзіўляцца? І ці трэба ва ўсім вінаваціць моладзь, калі яе цяпер ледзь не з пялёнак пачынаюць разбэшчваць? Вазьміце тое ж кіно, тэлебачанне, «зорнае» жыццё артыстаў і артыстак, дзе ўсё напаказ...

Няёмка параўноўваць, але ў наш час дзяўчатам нельга было вышэй калена агаліць ногі (што ўжо казаць пра грудзі), выставіць шлейку ад ліфчыка ці краёк бялізны... На памяці хіба адзін выпадак, калі дзяўчына паказала ледзь не ўсю сваю камбінацыю (ніжнюю сарочку) і сарвала тым самым проста шквал апладысментаў.

Расказ пра гэта пачну здалёк. Вёска наша ў вайну згарэла дашчэнту, але без людзей. Старыяды жанчыны з дзецьмі пазаставаліся. І нас, малых, было шмат. Нам трэба было вучыцца.

Таму на папялішчы перш за ўсё сталі будаваць школу, прычым будаваць з розумам, з разлікам на тое, каб яна была і клубам, і стадыёнам... Хочаш — прыходзь туды і займайся: гуляй у футбол, валейбол, гарадкі... Свой цір у нас быў, турнікі, драўляны шост замест каната...

Актавая зала таксама была будзь здароў! Мала хто мог такой пахваліцца! Фільмы ў ёй «круцілі», праводзілі калгасныя сходы і розныя вечары, ладзілі канцэрты. У якасці артыстаў выступалі ўсе ахвотныя: дзеці, настаўнікі, калгаснікі, Надзея, загадчыца так званай малочнай (пункта, куды з фермаў і падворкаў звозілі малако), ды і сам старшыня калгаса... Родам ён быў з Украіны — вельмі добра спяваў народныя песні.

...Дык вось, неяк раз ідзе чарговы канцэрт: хор ужо выступіў, праспявала сваю песню Надзея, потым — кароткая паўза і вядучы аб'яўляе матроскі танец. Гучыць знакамітае «Эх, яблочко...», на сцэну выскакваe спрытны марачок (на ім як мае быць усё: клёш, цяльняшка, бесказырка...) і выкідвае такія каленцы!.. Людзі з задніх радоў ажно паўставалі, каб лепей бачыць, дзеці з пярэдніх — самі кінуліся ў скокі...

Але ж раптам на поясе ў матроса замільгала нешта блакітнае, на вачах «падрасло» ў памерах, прапаўзло па шырокай «матроскай» калашыне — лягло на падлогу і... цішыня, як той казаў. Нават баян змоўк: «Што гэта было? Хто?..»

Здагадка мільганула, як тая маланка: ды гэта ж Надзя! Відаць, спехам прыбіралася ў форму марака: шлейкі камбінацыі з плячэй скінула — тая спаўзла на талію. А ў час танца яшчэ і ніжэй...

Добра, што дзеўка — ну сапраўдная ж артыстка! — не разгубілася: танцуючы, падхапіла згубу, узняла над галавой ды яшчэ і памахала...

Баяніст зайграў вясёлую, хтосьці крыкнуў «Брава!». Ад чаго Надзя яшчэ вышэй задрала галаву, выбіваючы дробат, зрабіла колькі кругоў па сцэне, і... Заслона закрылася.

Такога грому апладысментаў у нашай школе ні дагэтуль, ні пасля, здаецца, не было.

Любоў Чыгрынава,

г. Мінск.

...НЯДОЎГА ХЛОПЕЦ ТАНЦАВАЎ

Рэчка высахла на гразь...
Ды вадзіўся ў ёй карась.
Цікаваў за ім Валера:
Часу траціў — да халеры!
І рыбак жа вельмі хвацкі:
Майстраваў — любыя «цацкі»!
Кожны ранак, сонцу рады,
У ваду кідаў прынады...
Я і сам таму быў сведкам,
Як Валера бегаў з сеткай,
Як стаяў ён днямі з вудай...
А карась не йшоў нікуды:
Праплыве перад вачыма,
Нібы гоне хто ляйчынай,
Мільгане таўшчэзным бокам —
І сплывае з поля зроку...
Ну ніякага ж сумлення!
А ў Валеры ўжо й цярпення:
Здзекі рыб прыняўшы з болем,
Не пайшоў да рэчкі болей...
Потым — лівень!
І другі...
Заліло ўсе берагі:
Сцежкі й знаку анідзе...
Хтосьці плюхае ў вадзе!
Быў Валера ў лузе босым,
А той плёскат — перад носам.
І нікуды не плыве...
Хтось заблытаўся ў траве?!
...Уявіце зараз самі:
Хлопец голымі рукамі,
Нібы тое парася,
Падымае карася!
Прытуліўшы да шчакі,
Йдзе да берага ракі,
Дзе карась — як на бяду —
Плясь у чыстую ваду!
А Валера, як фанера...
Праўда тут, але не ўся:
Зноў ён ловіць карася.

Іван Астроўскі,

г. Мінск.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Неасабісты суб'ектыў

НА ЎСЁ АСТАТНЯЕ ЖЫЦЦЁ

Найстрашнейшае пакаранне — ад самога сябе

У роднай вёсцы пуста і ціха — дачны сезон яшчэ не распачаўся. Па заснежанай вуліцы — у апошні сакавіцкі дзень снегу накідала, бы зімой, — павольна сунецца, абапіраючыся на кій, адзінокая постаць. Прыглядаюся: цётка Ганна. Падыходзіць бліжэй, спыняецца, здароўкаецца. «Як вы?» — пытаюся. «Што табе, Алёнка, сказаць. Хворая зусім, ледзь хаджу. Але кожную раніцу да каплічкі падыходжу. Пастаю, памалюся, як умею, здаецца, і лягчэй становіцца...» Яна павольна паварочваецца тварам да капліцы, углядаецца ў фігурку Маці Божай, што добра відаць праз вялікія вокны, нешта сама сабе шэпча. Так і пакідаем яе каля той капліцы: затрымлівацца, каб паглядзець, што яна будзе рабіць далей, няма калі. Адзінокая постаць з кіёчкам у люстэрку машыны хутка знікае за паваротам вясковай вуліцы...

Усю недалёкую да Мінска дарогу думаю пра яе. Схуднелая, нямоглая, яшчэ не такая і старая. Кожную раніцу ідзе пад капліцу і ў тым знаходзіць сілы пражыць яшчэ дзень. У бацькоўскай не зусім занядбанай, але і не такой дагледжанай, як была пры ранейшых гаспадарах, хаце, з зусім невялікай пенсіяй, з несуцяшальным дыягназам... Такое жыццё? Так лёсіць? І так, ды толькі не зусім так.

Бо я памятаю, як яна прыязджала да бацькоў у вёску — вясёлая, прыбраная — гарадская. У сталіцы працавала ў сістэме гандлю — справа ў нашым грамадстве і сёння пачэсная, а ў часы «позняга застою» — і пагатоў. Бацькі былі людзі сціплыя, прыстойныя, непітушчыя, працавалі ўсё жыццё ў калгасе. На пенсіі пажылі нядоўга — неяк ціхенька, адно за адным, перасяліліся пад бярозы на Яшэўшчыне. Хата спачатку стаяла нейкі час пустая, а потым раптам з горада прыехала цётка Ганна з мужам. Як высветлілася, «на ПМЖ». З чаго б? «Мусіць, з магазіна выгналі», — шапталіся мясцовыя кабеты. Пакрысе, паралельна з тым, як сыходзілі з прыезджай апошнія прыкметы сталічнага лоску, стала зразумелая прычына пакінутага горада і страты такой прэстыжнай работы. Гарэлка. Літаральна на вачах маладая яшчэ жанчына ператварылася ў вясковую выпівоху. Кампанія знаходзілася заўсёды — у сярэдзіне 90-х многія так залівалі безграшоўе, беспрацоўе, безнадзейнасць. Многія, але не ўсе. Хтосьці выбраў цвярозы розум і пошук выйсця. Але гэта было нашмат складаней. Зрэшты, выбрацца з вясёлага задурманенага і бесклапотнага існавання, аднойчы ў яго ўцягнуўшыся, было не лягчэй.

Яна спрабуе гэта зрабіць цяпер. Калі многія сабутэльнікі ўжо адправіліся ў лепшы свет. Калі самой паставілі трывожны дыягназ і зрабілі складаную аперацыю. Яна кожную раніцу знаходзіць у сабе сілы, каб па доўгай вясковай вуліцы дайсці да капліцы і атрымаць ад Усявышняга моц пражыць яшчэ адзін дзень. І атрымлівае. Але колькі страчанага, што вярнуць ужо нельга. Толькі таму, што аднойчы зрабіла свой выбар не ў той бок і рабіла яго зноў і зноў, пакуль яго, выбару, і не стала зусім...

І тут жа раптам усплыла ў памяці яшчэ адна гісторыя, удзельніцай якой стала сяброўка. Яна, уласна, мне пра гэты жудасны па сваёй сутнасці выпадак і расказала. Летнім надвячоркам яны з мужам і маленькім сынам ехалі ў вёску да бацькоў. На вуліцы ўжо змяркалася, але неба было яснае, дарога амаль пустая, да таго ж машына новая, муж, які быў за рулём, доўгі час працаваў у ДАІ. Дый ехаць было зусім недалёка. Карацей, рызыкі ніякай. Але раптам у месцы, дзе дарога звужалася з-за рамонту, з сустрэчнай паласы на ўсёй хуткасці прама пад капот іхняму джыпу ўляцеў седан. Выраставала тое, што джып — машына вялікая і высокая на колах. Амаль усё абышлося — двухгадовы хлопчык зламаў ножку, бацькі панабівалі сінякоў. Чаго не скажаш пра тых, хто ехаў у седане. Мужчына, які быў за рулём, трапіў у бальніцу з мноствам пераломаў, яго жонка з больш цяжкімі траўмамі, у тым ліку і пазваночніка, тры месяцы была ў коме. У іх сына, таксама двухгадовага хлопчыка, якога маці падчас аварыі трымала на руках, шанцаў застацца жывым было вельмі мала. Яго праз лабавое шкло выкінула далёка на асфальт, і ніхто дапамагчы ўжо не змог...

Калі кіроўца седана падлячыўся, пачаўся суд. Сяброўка, сама даволі паспяховы адвакат, праходзіла з мужам як пацярпелая і падрабязнасці справы вывучыла добра. Кажа: лепш бы не вывучала. Тыя, што ў іх, лічы, на роўным месцы ўрэзаліся, сустракаліся са школы. Пажаніліся, дзяцей доўга не было. Вырашыліся на ЭКА. З першага разу не атрымалася. Намучыліся, яшчэ і ў даўгі ўлезлі, бо наступныя ж спробы платныя. Нарэшце з'явіўся такі доўгачаканы сынок... Выбраліся сям'ёй з сябрамі адпачыць на прыродзе некалькі дзён. Весела праводзілі час з ранку да позняга вечара, выпіваць пачыналі з самай раніцы... Вось так, выпіўшы з раніцы, муж вечарам зазбіраўся дамоў, хоць планаваці ўсе раз'язджацца назаўтра. «У мяне ўсё ўжо вычхалася», — заявіў. Жонка не пярэчыла, села напярадзе побач, узяла дзіця на рукі... У выніку пакалечаныя целы і мёртвая душа, бо як жыць з веданнем, што фактычна забіў адзінае дзіця?.. Лёс? Такое жыццё? Ці ўсё-ткі бяздумны выбар, за які давялося заплаціць такую страшную цану?

Мужчыну прысудзілі чатыры гады зняволення: ДТЗ са смяротным вынікам, яшчэ і амаль два праміле алкаголю ў крыві. Жанчына — самі разумееце. Пацярпелыя маглі б патрабаваць яшчэ і кампенсацыю: у дарагой машыны разбіты ўшчэнт перад, дый дзіця пацярпела. «Толькі нічога мы ў іх не патрабавалі, ад прэтэнзій адмовіліся. Яны самі сябе на ўсё астатняе жыццё пакаралі»...

Як звязаныя паміж сабой гэтыя дзве невясёлыя гісторыі? Выбар, шаноўныя. Кожны дзень, кожную хвіліну. Каб пасля не наракаць на жыццё або лёс.

Алена ЛЯЎКОВІЧ.

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор аукциона)
информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего
ГИПК «ГАЗ-ИНСТИТУТ» (Продавец)
на праве оперативного управления

Лот № 1:

ЛЕГКОВОЙ СПЕЦИАЛЬНЫЙ ХЭТЧБЕК (HATCHBACK) SKODA OCTAVIA,

кузов (рама) № TMBCA11Z162206941, 2006 г. в.

Начальная цена с НДС – 2 059,81 руб.
Местонахождение Лота № 1: г. Могилев, ул. Симонова, 6 (Могилевский филиал ГИПК «ГАЗ-ИНСТИТУТ»).

Аукцион состоится **04.05.2022 в 11.00**
по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и Организатора аукциона ino.by.

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

Закрытое акционерное общество

«На Уманской»,

расположенное по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 55,

СООБЩАЕТ О ВЫПЛАТЕ ДИВИДЕНДОВ ПО АКЦИЯМ:

Дата принятия решения общего собрания акционеров, в соответствии с которым осуществляется выплата дивидендов по акциям	31.03.2022 г.
Дивиденды, начисленные на одну акцию по результатам работы за 2021 г.	7 руб. 78 коп. на 1 простую акцию
Срок и порядок выплаты дивидендов по акциям по результатам работы за 2021 г.	Не позднее 30.04.2022 г. Перечисляются одновременно всем акционерам – владельцам простых акций, пропорционально количеству принадлежащих им акций

Общее собрание акционеров

УНП 101085067

ОАО «ПИНСКИЙ ВИНОДЕЛЬЧЕСКИЙ ЗАВОД»

сообщает о проведении 18.04.2022 г. первых повторных электронных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества:

1. Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-63750, наименование – квартира № 2, площадь 41,2 кв. м. Брестская обл., Пинский р-н, Молотковичский с/с, п. Садовый, ул. Совхозная, 10-2 – 4 480 белорусских рублей без НДС.

2. Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-63849, наименование – квартира № 3, площадь 40 кв. м. Брестская обл., Пинский р-н, Молотковичский с/с, п. Садовый, ул. Совхозная, 10-3 – 4 240 белорусских рублей без НДС.

3. Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-55176, наименование – квартира № 3, площадь 48,1 кв. м. Брестская обл., Пинский р-н, Молотковичский с/с, п. Садовый, ул. Совхозная, 12-3 – 4 960 белорусских рублей без НДС.

Подробную информацию можно узнать на сайте bankrot.gov.by.

УНН 200110728

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ № 2022.Б.002.00023

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего обществу с ограниченной ответственностью «Гипспромресурс», УНП 810001131, в отношении которого открыто производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 169-11Б/2015 в экономическом суде Гомельской области.

Номер лота, вид выставляемого на электронные торги имущества:
Лот № 1. Недвижимое и движимое имущество.
Информация о предмете торгов, в т. ч. место нахождения:
- капитальное строение с инвентарным номером 310/С-10670 по адресу: Гомельская область, г. Гомель, ул. Химзаводская, д. 5, площадь – 8625,9 кв. м, назначение – здание специализированное для производства строительных материалов, наименование – здание кирпичного цеха, административно-бытовой корпус ЦКК (инв. № 9600002, 9610002), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 340100000005006024, площадью 1,9197 га (право постоянного пользования). Составные части и принадлежности кап. строения: подвал, четыре пристройки, дымовая труба (кирпичная, высотой 30 м, площадь застройки 29 кв. м, инв. № 9600005), ограждение (железобетонное в железобетонных стаканах, длиной 323,4 м, высотой 2,32 м, инв. № 9600004), автодороги (асфальтобетонное покрытие по щебеночному основанию, площадь 2536 кв. м, инв. № 9600003), две площадки (асфальтобетонное покрытие по щебеночному основанию площадью 8162 кв. м, инв. № 9600200, бетонные плиты площадью 4319 кв. м, инв. № 9600192). Капитальное строение с инвентарным номером 310/С-18687 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Химзаводская, 5, площадь – 34,1 кв. м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание склада масел, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 340100000005006024, площадью 1,9197 га (право постоянного пользования). Ворота механические металлические; внутриплощадочные сети связи; внутриплощадочные сети канализации и водоснабжения керамические (инв. № 9600007); внутриплощадочные сети газоснабжения; внутриплощадочный теплопровод; внутриплощадочные кабельные сети в алюминиевой оболочке; электропроводка силовая до 10КВ (инв. № 9600013); трансформатор силовой масляный мощностью 630 кВА (трансформаторная подстанция 2КТП-630, инв. № 9600015); пункт распределительный ПР 24-3104 (инв. № 9600017); пункт распределительный ПР 24-7210 (инв. № 9600018); пункт распределительный ПР 24-710 (инв. № 9600019); таль ТЭ-521 (инв. № 443414); кран мостовой грейферный (инв. № 9600119) (далее – имущество). **Местонахождение имущества:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Химзаводская, 5.
Имущество, бывшее в употреблении.
Начальная цена: 2 216 020,00 белорусского рубля без учета НДС (освобождение от уплаты НДС согласно п. 2.30.2 ст. 115 НК РБ).
Минимальная цена: 1 329 612,00 белорусского рубля без учета НДС.
Размер шага составляет 5 процентов цены за лот, складывающейся в ходе электронных торгов.
Дата и время начала и завершения электронных торгов: 04.05.2022 с 9.00 до 16.00.
